Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 9 1933 г. № 125 (4669)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Тав. Мікаян у Валмянскай рыбнай гаспадарцы

7 чэрвеня народны камісар снабжэньня СССР тав. МІКАЯН разам са старшынёю СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДАМ, намесьнікам старшыні СНК тав. БАЛЦІНЫМ, намесьнікам народнага камісара снабжэньня БССР тав. ГЕАРГАДЗЭ выехалі ў Чэрвеньскі раён, дзе дэтальна азнаёміліся з ходам будаўніцтва буйнейшай прудовай гаспадаркі «Волма» па разьвядзеньні зэркальнага галіцыйскага карпа.

Гэты рыбгас Белрыбтрэсту займае тэрыторыю ў 1.360 гэктараў. Ужо ў будучым годзе ён павінен даць для снабжэньня пралетарскіх цэнтраў 4.000 цэнт. карпа, выведзенага з мальга.

Пры рыбгасе «Волма» створана птушыная фэрма на 3.000 качак.

У будаўніцтва гаспадаркі ўжо ўкладзена каля паўтара мільёна руб. На 1933 год адпушчана 600 тыс. руб.

Пасьпяховае разгортваньне работ тармозіцца з-за незабясьпечанасьці будаўніцтва рабочай сілай. Не хапае 500 рабочых, у тым ліку 200 грабароў.

Валмянскі рыбгас зрабіў добрае ўраджаньне на тав. МІКАЯНА, які ўказаў на вялізарныя пэрспэктывы і будучыню гаспадаркі і даў дырэктару рыбгасу тав. ЯБЛЫКАВУ рад практычных заўваг.

У прыватнасьці, НАРКОМ ПАКАЗАЎ НА НЕАВХОДНАСЬЦЬ ПАШЫРЭНЬНЯ ПТУШЫНАЙ ФЭРМЫ ДА 25.000 КАЧАК І АРГАНІЗАЦЫІ ГУОІНАЙ ДАПАМОЖНАЙ ГАСПАДАРКІ.

ПА ДУМЦЫ ТАВ. МІКАЯНА Ў РЫБГАСЕ Ў ВЫГЛЯДЗЕ ВОПЫТУ МЭТАЗГОДНА СТВАРЫЦЬ ПРУДАВЫ ВУЧАСТАК У 10 ГЭКТАРАЎ ДЛЯ РАЗЬВЯДЗЕНЬНЯ РАКАЎ.

Тав. МІКАЯН зьвярнуў увагу сакратара Чэрвеньскага райкому партыі т. ВАСІЛЬЛЕВАЙ на неабходнасьць прыняцьця райённымі арганізацыямі ўсіх мер для забесьпячэньня рыбгасу рабочай сілай з тым, каб будаўніцтва скончыць у бягучым годзе.

Зах. вобласьць ужо засеяла лён, а ў нас сяўба ганебна зацягнулася, плян яравых выканан усяго на 86,6 проц.

Талачынскае кіраўніцтва сабатуе дырэктывы ЦК і СНК, Віцебск па-ранейшаму зрывае сяўбу

ЗАРАЗ-ЖА ПОУНАСЬЦЮ ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ!

За хутчэйшую і поўную рэалізацыю рабочых прапаноў

Дапоўніць пафас новага будаўніцтва пафасам асваеньня новых заводаў, новай тэхнікі, сур'ёзным узьняцьцем працыйнасьці працы, сур'ёзным скарачэньнем сабекошту, у гэтым,—кажа тав. Сталін,—цяпер галоўнае».

Аўпаданьне тэхнікай—зараз рашаючае зьвяно, за якое патрэбна ўхапіцца, каб выцягнуць увесь ланцуг пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва. Даць мільённым масам рабочага калектыву патрэбныя веды тэхнікі, мабілізаваць іх творчую ініцыятыву на далейшае стварэньне сваёй упаснай тэхнікі сацыялістычнай якасьці—цэнтральная задача сёнешняга дня.

Сацыялістычная індустрыялізацыя дае вялізарныя, немагчымыя ў капіталістычным грамадзтве, умовы для творчай ініцыятывы рабочых мас.

Масавае вынаходзтва—адна з важнейшых форм непасрэднага ўдзелу шырокіх колаў працоўных у справе ўкараненьня новай тэхнікі ў народную гаспадарку, у справе рацыяналізацыі сацыялістычнай вытворчасьці.

Зараз праходзіць месячнік праверкі рэалізацыі рабочых прапаноў і вынаходзтваў. Месячнік мае вялізарнае палітычнае і гаспадарчае значэньне для нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Яго мэта—правесьці масавы агляд становішча вынаходзтва з пункту гледжаньня барацьбы за хутчэйшую рэалізацыю ўсіх каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходак, якія накіраваны на далейшае стварэньне сацыялістычнай якасьці тэхнікі, на яе асваеньне, на скарачэньне імпарту, павышэньне прадукцыйнасьці працы і, зьніжэньне сабекошту прадукцыі, на папяпшэньне яе якасьці і зьнішчэньне браку ў вытворчасьці.

Месячнік праверкі рэалізацыі рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходзтваў—гэта баявы агляд барацьбы партыйных і прафсаюзных арганізацый за выкананьне гістарычных пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Ня гледзячы на тое, што месячнік абвешчан пастановай УсеЦСПС з 15 мая, яшчэ да гэтага часу цэлы рад прафсаюзных арганізацый не падхапіў заклiку УсеЦСПС.

Некаторыя прафсаюзныя арганізацыі не ацанілі месячніка, як палітычна-масавай кампаніі, і не разгарнулі бальшавіцкай работы па мабілізацыі рабочых мас на праверку дзейнасьці БРЫЗ'аў, аддзелаў рацыяналізацыі, ячэек «таварыства вынаходцаў» (Віцебск, Магілеў, Барысаў і інш.). Рад прафсаюзных арганізацый не растлумачылі задачы месячніка шырокім рабочым масам. На фабрыцы «Беларуска» аб месячніку даведаліся толькі 20 мая. Да сёнешняга дня амаль ні на адным прадпрыемстве Магілева не працуюць праверачныя брыгады. Работнікі прафсаюзных арганізацый абмежаваліся толькі нікчэмнай пісанінай.

Пасобныя прафсаюзы яшчэ не ўсьвядомілі сваёй кіруючай ролі месячнікам, як і ўсёй справай масавага вынаходзтва. Фабкомы часта лічаць, што кіраўніцтва месячнікам ажыцьцяўляцца ня імі (фабкомамі), а БРЫЗ'амі.

На швэйнай фабрыцы імя Валадарскага (Магілеў) загадчык аддзелу рацыяналізацыі і БРЫЗ'у, ён-жа і кіраўнік праверачнай брыгады.

Цэлы рад гаспадарчых арганізацый выйшлі да месячніка фармальна і не дапамагаюць прафсаюзным арганізацыям у правядзеньні гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. Аддзелы рацыяналізацыі трэстаў лічаць гэта справай рабочай. Канкрэтнымі ўказаньнямі, пасылкай жывых людзей на прадпрыемствы—яны не дапамагаюць. (Тэкстыльтрэст, Шэйтрэст, Шкловтрэст). Наогул кажучы, няма яшчэ такога зруху, укараненьня ў вытворчасьць рацыяналізатарскіх прапаноў, якога патрабуе партыя ад месячніка агляду рабочага вынаходзтва.

Першыя вынікі праверкі паказваюць невычарпальныя крыніцы творчай ініцыятывы рабочых мас. Праверка ўскалыхнула шырокія колы ў справе сацыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці, асваеньня новай тэхнікі.

Рабочыя на прызыў свайго кіруючага штабу УсеЦСПС адгукнуліся ў часе правядзеньня месячніка тысячамі каштоўнейшых рацыяналізатарскіх прапаноў. У Белхімпраме за ўвесь 1932 год паступілі ўсяго толькі дзьве прапановы, у той час, як за апошнія дні ўнесена 33 рацпрапановы.

Але, з другога боку, месячнік з усёй выразнасьцю паказаў, што СКАРЫСТАНЬНЕ ВЫНАХОДЗТВАЎ І РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ І Ў ГАСПАДАРЧЫХ ОРГАНАХ ПАСТАЎЛЕНА ЎПОЛНУ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

З-за бюракратычнай цеганіны, недапушчальнай коснасьці і недаацэнкі некаторымі гаспадарчымі, прафсаюзнымі арганізацыямі ўсяго значэньня масавага вынаходзтва (а ў цэлым радзе выпадкаў і простага шкодніцтва ў вынаходчай справе)—вялізарныя запасы каштоўнейшых рацыяналізатарскіх рацыных прапаноў, якія змаглі-б даць мільёны рублёў эканоміі савецкай краіне.

На 1 студзеня 1933 году толькі па 57 прамысловых прадпрыемствах БССР ня была разгледжана 331 прапанова і знаходзіліся ў стадыі распрацоўкі 924 рацпрапановы. Такім чынам «перахопачы астатак» складае 1.256 рабочых прапаноў.

За першы квартал першага году другой пяцігодкі рабочыя гэтых-жа прадпрыемстваў, у адказ на заклік правадыра партыі тав. СТАЛІНА на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб асваеньні новай тэхнікі, яшчэ ўнесьлі 2.976 прапаноў і ўдасканаленьняў.

Штодзенна папаўняецца партфэль аддзелу рацыяналізацыі на прадпрыемствах і ўстановах усё новымі і новымі рабочымі прапановамі, а рэалізацыя іх ідзе зусім дрэнна.

Ход месячніка выявіў, што на 1 красавіка па тых-жа 57 прадпрыемствах зусім яшчэ не разгледжана 498 рабочых прапаноў, 688 знаходзіцца ў так званай стадыі распрацоўкі.

Але тыя прапановы, якія ўжо прыняты да ажыцьцяўленьня, зусім марудна рэалізуюцца на вытворчасьці. З агульнай колькасьці прынятых прапаноў 1.641, здана ў эксплёатацыю толькі 1.054.

СЛАБЫ ВУЧАСТАК У РАБОЦЕ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА КІРАЎНІЦТВУ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІМ РУХАМ — БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСЬЦЬ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ, ЗА ВЫШЭЙШУЮ ІХ НАРОДНА-ГАСПАДАРЧУЮ ЭФЭКТЫЎНАСЬЦЬ. У выніку гэтага ў першым квартале з агульнага ліку разгледжаных прапаноў было прынята 1.641, адхілена 1.409.

Ход месячніка выявіў, што расходваньне фондаў на вынаходніцкую і рацыяналізатарскую справу не пастаўлена на належную вышыню. На фабрыцы «СПАРТАК» (Гомель) з агульнага фонду на гэту справу ў 26.168 РУБ. у першым квартале фактычна расходавана ўсяго 121 руб., па віцебскай абутковай фабрыцы з 10.000 руб. расходавана 187 руб., па заводу «Пралетары» (Гомель) адпаведныя лічбы—24.240 руб. і 320 руб.

Ці гэта факты эканомнага расходваньня дзяржаўных сродкаў?

Не. Гэта вынік абураючай работы шэрагу гаспадарчых, прафсаюзных арганізацый па рацыяналізацыі сацыялістычнай вытворчасьці, вынік адсутнасьці барацьбы за сапраўдную эканомію, якую змаглі-б даць рабочыя прапановы.

Толькі па падлічаных 303 рацпрапановах, з ліку рэалізаваных у першым квартале гэтага году 1.054, атрымліваюцца мільёны рублёў эфэктыўнасьці. Вось дзе сапраўдная эканомія, не гаворачы ўжо аб папяпшэньні ўмоў працы рабочага.

Гэты вучастак работы, бязумоўна, патрабуе самай блізкай увагі з боку праф арганізацый. Зараз праходзіць праверка балянсаў і справаздачнасьці на буйных прадпрыемствах. Неабходна расшыфраваць гэты артыкул балянсу і выявіць прычыны і канкрэтных вінаватых у нескарыстаньні вызначаных сродкаў на справу вынаходзтва.

ЗАСТАЎШЫЯСЯ ДНІ МЕСЯЧНІКА ПА ПРАВЕРЦЫ РЭАЛІЗАЦЫІ РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ—СКАРЫСТАЦЬ, ЯК ШТУРМАВЫЯ ДНІ ПА ВЫЯЎЛЕНЬНІ НЕДАХОПУ Ў СПРАВЕ КІРАЎНІЦТВА МАСАВЫМ ВЫНАХОДЗТВАМ.

МЕСЯЧНІК ПАВІНЕН СТАЦЬ АДПРАЎНЫМ ПУНКТАМ РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ НА ВЫНАХОДЗКІМ ФРОНЦЕ.

Арганізацыя і хутчэйшае скарыстань не каштоўнейшых рацпрапаноў павінны стаць важнейшай справай прафсаюзных, гаспадарчых і партыйных арганізацый.

Забясьпечыць цалкам свячасовы разгляд, улік эфэктыўнасьці і рэалізацыю рабочых прапаноў, стварыць для гэтага неабходныя вытворчыя базы (экспэрымэнтальныя майстэрні, брыгады, тэхнічныя кансультацыі і г. д.)—чарговыя задачы гаспадарчых арганізацый.

«УСЯ РАБОТА ВЫНАХОДЦАЎ І ВЫНАХОДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ ПАВІННА БЫЦЬ ЦЯСЬНЕЙШЫМ ЧЫНАМ УВЯЗАНА З АГУЛЬНЫМ ПЛЯНАМ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ І РЭКАНСТУКЦЫІ, З ШЫРОКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА АБМЕНУ ВОПЫТАМ ПАМІЖ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ» (пастанова ЦК УсеКП(б) ад 26 кастрычніка 1930 году).

Задача партыйна-камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый—мабілізаваць масы на далейшую рацыяналізацыю сацыялістычнай вытворчасьці, на барацьбу за якасьць рацыяналізатарскіх прапаноў.

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове (1930 год) разглядае «выпадкі невыкананьня дырэктыў па вынаходзтву, як адзін з горшых відаў апартунізму на практыцы».

Самым рашучым чынам весьці барацьбу з душыцелямі рабочай ініцыятывы, з цеганінай, бюракратызмам, якія яшчэ ёсьць у пасобных зьвенях апарату.

Трэба скарыстаць вытворчыя таварыскія суды, як органы масавага ўзьдзеяньня, якія адыграюць вялізарную ролю ў барацьбе за ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў.

Шэфства прафсаюзных арганізацый над пасобнымі вынаходцамі і іх вынаходкамі ёсьць непасрэдная форма дапамогі рабочай здагадцы.

Кожны ЦК прафсаюзу, заўкомы павінны зараз-жа разгарнуць масавую работу па выяўленьні пепшых вынаходцаў і іх вынаходак, каб узяць над імі канкрэтнае шэфства.

БАБРУЙСК БЯРЭ НА БУКСІР БЕШАНКОВІЧЫ

Пастановай камісіі ЦК КП(б)Б па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю Бабруйскаму раёну даручана аказаць дапамогу Бешанковіцкаму раёну. Бабруйск бярэ на буксір Бешанковічы.

ЗВОДКА НКЗ БССР АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ ЯРАВЫХ НА 5 ЧЭРВЕНЯ

РАЁНЫ	Засеяна ў процантах	Па сэктарах: Саўгасы	Калгасы	Адпаасобнікі
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА				
Асьвейскі	61,9	—	66,2	53,5
Аршанскі	88,1	—	100,8	64,3
Бешанковіцкі	57,9	—	73,3	47,7
Віцебскі	65,7	77,3	75,9	42,7
Вушацкі	80,7	74,1	96,9	59,3
Гарадоцкі	56,0	—	71,9	40,8
Дубровенскі	74,1	—	85,2	85,3
Дрысенскі	68,6	91,8	76,2	54,9
Лёзьнянскі	71,1	—	78,8	40,0
Лепельскі	86,2	57,2	94,5	68,1
Полацкі	98,6	—	106,4	56,2
Расонскі	77,0	—	87,0	64,4
Сураскі	71,9	—	81,2	63.9
Сеньненскі	75,9	—	89,8	39,5
Сіроцінскі	51,8	9,0	60,4	44,1
Чашніцкі	79,6	—	97,8	47,7
Усяго па зоне:	**72,8**	**113,5**	**85,5**	**53,5**
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА				
Асіпавіцкі	85,6	65,2	97,7	78,6
Быхаўскі	98,5	103,8	96,9	99,2
Барысаўскі	104,1	116,3	113,3	99,0
Бялыніцкі	100,9	—	93,2	99,5
Бягомольскі	100,8	—	96,4	104,5
Бярэзінскі	99,8	100,2	101,4	97,3
Горацкі	78,0	68,7	83,9	71,2
Заслаўскі	97,4	108,1	104,3	82,0
Клімавіцкі	83,8	108,5	90,3	62 6
Крупскі	88,5	57,8	98,3	78,2
Копыльскі	102,9	121,5	110,6	86,4
Касьцюковіцкі	90,0	115,4	93,6	80,0
Клічаўскі	98,6	—	89,2	94,4
Дзяржынскі	82,5	103,8	88,7	61,9
Крычаўскі	91,7	162,0	102,1	71,6
Лагойскі	83,2	—	99,6	66,8
Магілеўскі	98,5	92,0	116,1	88,1
Мсьціслаўскі	78,4	—	84,6	40,5
Менскі	102,3	108,5	104,8	82,9
Прапойскі	90,3	—	92,8	77,7
Пухавіцкі	100,0	98,8	116,1	94,0
Смалявіцкі	100,6	81,6	121,9	88,9
Талачынскі	81,2	—	90,1	63,6
Чэрвеньскі	100,8	78,9	100,7	103,1
Чэрыкаўскі	85,1	—	101,2	59,8
Чавускі	103,0	—	117,1	93,6
Шклоўскі	100,4	94,8	104,8	96,6
Вузьдзенскі	99,6	66,8	115,1	82,5
Плешчаніцкі	101,3	—	110,7	80,2
Усяго па зоне:	**93,6**	**118,3**	**99,7**	**85,2**
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА				
Брагінскі	103,3	—	110,7	94,4
Б.-Кашалёўскі	96,3	—	95,3	91,2
Бабруйскі	102,6	95,2	107,1	101,6
Вепкаўскі	67,0	96,1	87,6	85,0
Глускі	96,7	—	102,7	90,1
Гомельскі	100,1	—	114,2	70,4
Жыткавіцкі	103,7	46,5	100,2	118,7
Каромятскі	99,0	—	98,7	99,8
Камарынскі	105,4	—	110,6	88,4
Жлобінскі	93,6	77,0	95,7	89,6
Ельскі	102,8	—	103,3	91,3
Лоеўскі	98,1	—	104,4	93,7
Любаньскі	101,4	99,8	101,0	94,6
Лельчыцкі	102,9	—	110,1	98,8
Мазырскі	102,5	—	118,0	89,6
Нараўлянскі	98,0	82,3	98,1	99,2
Парыцкі	101,7	84,4	126,0	91,6
Петрыкаўскі	103,1	—	104,5	99,5
Рагачоўскі	108,2	—	107,9	102,5
Рэчыцкі	100,5	—	100,6	99,7
Слуцкі	104,4	—	108,1	90,3
Старобінскі	101,2	—	107,1	94,9
Старадарожскі	103,5	—	114,8	95,7
Тураўскі	104,2	89,6	111,0	100,2
Церахаўскі	92,5	—	100,8	83,1
Чачэрскі	99,2	77,0	116,1	90,3
Ч.-Слабодзкі	103,6	—	110,4	96,1
Ч.-Польскі	101,8	84,0	104,5	99,0
Уваравіцкі	108,2	—	92,6	98,5
Хойніцкі	97,0	90,4	95,6	98,5
Усяго па зоне:	**100,3**	—	**104,9**	**94,4**
ПА БССР:	**86,6**	**85,9**	**93,0**	**90,4**

МАЎЧАЛЬНІКІ З ТАЛАЧЫНА

«Неадкладна засеяць кожны недасеяны гэктар»—гэта аншлаг першай паласы апошняга нумару раённай газэты «КАЛГАСЬНІК ТАЛАЧЫНШЧЫНЫ» (ад 5 чэрвеня).

Пад загалоўкам—«Дабіцца неадкладнай і поўнай перамогі» друкуецца перадавы артыкул, каментуючы зводку аб ходзе сяўбы ў раёне на 1 чэрвеня.

Усе тэрміны сяўбы прайшлі. Мінуў канчатковы тэрмін і для адстаючых раёнаў. Па Талачынскім-жа раёне на 1 чэрвеня плян сяўбы выкананы быў толькі на 69 проц. Талачынскі раён ужо больш паўмесяца НА ЧОРНАЙ ДОШЦЫ.

2 чэрвеня тэлеграмай ЦК і СНК робіцца катэгарычнае папярэджаньне адстаючым раёнам аб неабходнасьці максымум да 5 чэрвеня цалкам завяршыць сяўбу.

«Кіраўніцтву кожнай партыйнай і савецкай арганізацыі,—гаворыцца ў тэлеграме,—павінна быць зразумела, што неадпаразовыя папярэджаньні ЦК і СНК аб неабходнасьці сапраўднай бальшавіцкай барацьбы за сяўбу ня будуць заставацца толькі словамі і неабходныя палітычна-арганізацыйныя вывады будуць зроблены ў адносінах да тых, хто апошняга папярэджаньня не зразумее, або будзе яго сабатаваць».

Якія-ж вывады зрабілі для сябе кіруючыя арганізацыі Талачынчыны з дырэктыў ЦК і СНК?

ЛІТАРАЛЬНА НІЯКІХ

Талачынскі РК КП(б)Б і РВК паваг словам не адпазнуліся на тэлеграму. А кіраўніцтва рэдакцыі «Калгасьнік Талачыншчыны» аказалася настолькі палітычна блізарукім, што **нават не апублікавала тэлеграмы, проста ўтаіла ад мас гэты важнейшы дакумант.**

Раённае кіраўніцтва апынулася ў палоне кулацкіх тэндэнцый, яно проста стала на шлях сабатажу дырэктывы ЦК і СНК. Старшыня РВК ДЗІНЭРШТЭЙН і загадчык агітмасавага аддзелу РК КП(б)Б СЯМЕНАЎ адкрыта заграбарылі языком кулацкай агентуры.

— Не асілім заданьня, больш 80 проц. плану ня выканаем.

Вось дзе карэні прычын, што і за апошні тэрмін завяршэньня сяўбы для адстаючых раёнаў—5 чэрвеня—та Талачынскім раёне плян выкананы толькі на 81,2 проц.

А ў гэты час са старонак «Калгасьніка Талачыншчыны» павяе халадком. Телеграма т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА не апублікуецца і не каментуецца. Рэдакцыя «Калгасьніка Талачыншчыны» толькі і зрабіла «лас ку», што ў перадавым артыкуле за 5 чэрвеня мімаходам заўважыла ў двух словах «ЦК КП(б)Б даў апошнае папярэджаньне тоім партарганізацыям».

Аб тым, што гэта папярэджаньне датычыць у першую чаргу Талачынскага раёну, як занесенага на чорную дошку за ганебны правал сяўбы, родак цьля, па вядомых толькі ёй прычынах, замоўчвае і разам з тым маскуе фактычнае становішча сяўбы ў раёне, змазвае асноўныя прычыны прарыву.

ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ СКОНЧЫЛА СЯЎБУ ІЛЬНУ

ЦК УсеКП(б)—СТАЛІНУ, КАГАНОВІЧУ, СНК СССР—МОЛАТАВУ, ЦО „ПРАВДЕ".

Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. СТАЛІНЫМ Заходняя вобласьць—ільнаводчая база Савецкага Саюзу—заданьне ЦК і ўраду засеяць 580.000 гэктараў ільну ВЫКАНАЛА поўнасьцю да 5 чэрвеня, на 10 дзён раней мінулага году пры больш высокай якасьці пасеўных работ.

Вобласьць прымае ўсе меры, каб ліквідаваць адставаньне і па іншых культурах і закончыць поўнасьцю сяўбу ў бліжэйшыя дні.

Сакратар Захабкому РУМЯНЦАЎ.

Старшыня аблвыканкому РАКІТАЎ.

МАГІЛЕЎСКІ РАЙКОМ КП(б)Б АБ АРТЫКУЛЕ „ЗЬВЯЗДЫ"

МАГІЛЕЎ, 8. (Па тэлефону ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Бюро райкому КП(б)Б і прэзыдыум РайКК абмеркавалі перадавы артыкул «ЗЬВЯЗДЫ» ад 6 чэрвеня.

У сваёй пастанове бюро РК і РКК прызнаюць цалкам ПРАВІЛЬНЫМІ сыгналы «Зьвязды».

Бюро райкому і прэзыдыум РайКК адзначылі, што плян сяўбы на раёне выкананы са значным, зусім недапушчальным спазьненьнем супроць тэрмінаў, устаноўленых ЦК КП(б)Б і СНК.

Бюро РК і прэзыдыум РКК прызнаюць зусім правільнай жорсткую крытыку раённага партыйнага і савецкага кіраўніцтва, даную ў тэлеграме ЦК і СНК і ў перадавым артыкуле ЦО «Зьвязда» ад 6 чэрвеня.

Бюро райкому і прэзыдыум РКК прызнаюць, што ў сваёй пастанове ад 3 чэрвеня яны ня далі разгорнутай крытыкі сваіх памылак.

Загадчык райземаддзелу КАМЕДАЎ, які ня справіўся з работай па кіраўніцтве веснавой сяўбой, пастановай РК і прэзыдыумам РКК ЗЬНЯТ З РАБОТЫ.

Старшыня Княжыцкага сельсавету РАДКЕВІЧ выключан з партыі і зьняты з работы. Бюро парт'ячэйкі Княжыцкага сельсавету распушчана. Сакратар парт'ячэйкі РОДЗІН зьняты з работы і яму абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

Упаўнаважанаму РК і РВК па Княжыцкім сельсавеце ЯФРЭМЕНКА абвешчана вымова.

За апушчанства выключан з партыі былы дырэктар саўгасу Давыдаўка ЯФРЭМАЎ.

НЭЙДЛІН.

Чорная дошка

Пастановай калёгіі ЦК КП(б)Б па спаборніцтву з Заходняй вобласьцю за ганебныя тэмпы сяўбы занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА

ВЕТКА — 87 проц. Сакратар РК КП(б)Б КАЎРЫГІН, старшыня РВК СЬЛЮКІН.

ЦЕРАХАЎКА — 92,5 проц. Сакратар РК СУРБА, старшыня РВК ДУПАНАЎ.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА

ГОРКІ — 78 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЧОРНАБРОДАЎ, старшыня РВК КАНДРАЛЬ.

МСЬЦІСЛАЎЕ — 78,4 проц. Сакратар РК КП(б)Б РАМАНЕНКА, старшыня РВК МАРОН.

ТАЛАЧЫН—81,2 проц. Сакратар РК КП(б)Б СЛАВІН, старшыня РВК ЛОЦМАНАЎ.

ДЗЯРЖЫНСК — 82,5 проц. Сакратар РК ДАМБРОЎСКІ, старшыня РВК ВАНСОЎСКІ.

ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА

СІРОЦІНА — 51,8 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІРОНЕНКА, старшыня РВК ЦОФІН.

ГАРАДОК — 56 проц. Сакратар РК КП(б)Б ЭЛЬМАН, старшыня РВК ЕЎДАСЕЎ.

БЕШАНКОВІЧЫ — 57,9 проц. Сакратар РК ЯКАЎЛЕЎ, старшыня РВК ШАХ.

ВІЦЕБСК — 65,7 проц. Сакратар РК КП(б)Б МІЦЬКОЎ, старшыня РВК КАРДАШОНКА.

СЯЎБА ПА МЭТАДАХ ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМУ

Віцебскі гарком КП(б)Б кажа і пасьля спэцыяльнага папярэджаньня з боку ЦК і СНК не дабіўся ніякага зруху ў сяўбе. Раён па-ранейшаму ганебна зацягвае сяўбу. Сам гарком замест неадкладнага завяршэньня сяўбы ўхваліў пастанову, у якой расьцягвае тэрміны сяўбы да 10 дзён...

ЯК-НЕБУДЗЬ ДАБЯРЭМСЯ...

ДЗЕСЯТАГА І НЕ РАНЕЙ...

ВІЦЕБСКІ ГАРКОМ НЕ ВЫПРАЎЛЯЕ СВАІХ ПАМЫЛАК

ВІЦЕБСК, 7 (Ад нашых карэспандэнтаў).

Штодзенны прырост у 2 і самае больш шае ў 2½ процанты—так ідзе сяўба ў раёне. Толькі 65,6 проц. пляну на 5 чэрвеня! Засеяна ўсяго 28.564,6 га. Пры рост па адпаасобных сэктары за гэты час яшчэ больш мізерны—7,4 проц. Плян сяўбы выкананы толькі на 48,3 проц.

Такімі, вось, з дазволу сказаць, справамі адказваюць віцебскія арганізацыі на тэлеграму т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА. Такія рэзультаты пастановы гаркому партыі, дае кампаніяк тэрмінам, вызначаным ЦК і Саўнаркомам, устаноўлены свае, віцебскія тэрміны скончэньня сяўбы, якія выходзяць з «рэальных умоў» кожнага сельсавету, а іменна — 10 ЧЭРВЕНЯ...

Чарговую адтэрміноўку, якую даў гарком, хутка падхапілі на месцах. Калі гарком сказаў 10-га чэрвеня, значыць 10-га і но... раней.

Аб тым, як забясьпечылі гарком партыі і гарсавет выкананьне дырэктыў ЦК і СНК, красамоўна сьведчыць ход сяўбы па сельсаветах.

Характэрнай ілюстрацыяй зьяўляецца СТАРАСЕЛЬСКІ сельсавет. 5-га чэрвеня тут, жарэшце сабраліся «давесьці тэлеграму ЦК і СНК да шырокіх мас». І давялі... Быў праведзен аб'яднаны сход аднаасобнікаў двух вёсак Васілёнкі і Новікі. Сход фактычна правалілі: было ўсяго 8 чалавек.

— Усё-ж,—заяўляе брыгадзір сельсавету т. ГАРАС,—мы пагаварылі аб сяўбе і паразьлілі, правільней, загадалі, каб сяўба была скончана не пазьней 10 чэрвеня.

Тут брыгадзір раптам сьціхае, а потым пэнтам пэўафіцыяльна дадае:

—Куды там, і за гэты тэрмін наўрад ці адосемся...

?!?

Гэта і называецца ў Віцебску... даваздзеньнем да мас дырэктыў ЦК і СНК.

У вёсцы Кавальчі таксама правялі, правільней кажучы, хацелі правесьці сход. Падрыхтоўчая работа была тут, праўда, яя дрэнная, людзі прышлі, але... не зьявіліся самі арганізатары сходу. У сельсавеце нават ня ведаюць добра, хто ўсё-ж павінен быў праводзіць сход у гэтым пункце— ці то сам старшыня сельсавету Аржаноўскі, ці настаўнік Ляхоўскі ці яшчэ хто...

Віцебскае ігнараваньне дырэктыў ЦК і СНК, самацёк, бястурботнасьць, безадказнасьць — вось у чым карэньні, што і апошняя пяцідзеўка не дала амаль ніякага зруху.

У раёне асабліва моцна адчуваецца апартуністычная недаацэнка адпаасобніка. Гэта зноў відаць хоць-бы з практыкі таго-ж Старасельскага сельсавету. Ніякай масава-растлумачальнай работы сярод аднаасобнікаў няма. Ня дзіва, што нават цяпер, калі ўжо даўно прайшлі ўсе тэрміны і сяўба павінна быць скончана, **ДВЕСЯТКІ АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРАК НАВАТ НЯ ПРЫСТУПАЛІ ДА СЯЎБЫ.** Аднаасобнікі вёсак Васілёнкі і Новікі, напрыклад, замест 55 га ўзаралі толькі 10 гэктараў, а сяўбы яшчэ і цяпер не пачынаюць. Сам член сельсавету Мільлянчыка адкрыта сабатуе сяўбу. 20 гаспадарак Касьцюкоўскага пункту таксама да сяўбы не прыступілі, не засеялі ні аднаго гэктара і шмат іншых гаспадарак у Ламаўскім і іншых пунктах.

Куладзкі сабатаж сяўбы прыняў асабліва моцную форму. Цьвёрдазаданьнікі, каб сарваць пасеўную кампанію, прадаюць свае коні. Ні аднаго сабатажніка НЕ ПРЫЦЯГНУЛІ, АДНАК, ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

У Старасельскім сельсавеце ўпаўнаважаным гаркому і гарсавету зьяўляецца ГАРЭЛІК, ён-жа нам. старшыні Віцебскага гарсавету. Гэта той самы Гарэлік, які ў тым-жа Старасельскім сельсавеце, будучы таксама ўпаўнаважаным гаркому і гарсавету, ПРАВАЛІЎ загаворчую кампанію.

На прыкладзе Старасельскага сельсавету мы паказалі, наколькі безадказна, наколькі фармальна адносіліся ў раёне да тэлеграмы ЦК і СНК.

ГАРКОМ СВАЁЙ АДТЭРМІНОЎКАЙ ДАЎ НОВЫ ПОВАД ДЛЯ АПАРТУНІСТЫЧНЫХ СПРОБ ЗАЦЯГНУЦЬ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ.

Колькі-ж яшчэ папярэджаньняў, колькі сыгналаў трэба віцебскаму гаркому?

Арн. Э., А. М.

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

ЗА ЛІБЭРАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ, ПРАЯЎЛЕНЫЯ Ў СПРАВЕ БАРАЦЬБЫ ЗА СЯЎБУ І НЯПРЫНЯЦЬЦЕ РАШУЧЫХ МЕР ДА РАЗГОРТВАНЬНЯ СЯЎБЫ, — ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ СТАРШЫНЮ ГАРАДОЦКАГА РВК ТАВ. ЕЎДАСЬСЕВА І АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫ

10 ГОД ФІЗКУЛЬТУРНАГА РУХУ Ў БССР

Гутарка са старшынёй ВСФКБ т. Закоўскім

Старшыня ВСФКБ і ўрадавай камісіі па падрыхтоўцы ўсесаюзных спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы тав. ЗАКОЎСКІ ў гутарцы з карэспандэнтам «ЗЬВЯЗДЫ» паведаміў наступнае:

12 чэрвеня фізкультурная арганізацыя БССР адзначае свой 10-годавы юбілей. Да гэтага дня рыхтуецца вялікі парад, у якім прымуць удзел 10 тыс. фізкультурнікаў Савецкай Беларусі.

БССР, у мінулым адсталая акраіна царскай Расіі, дасягнула ў сучасны момант вялізарных посьпехаў у эканамічным і нацыянальна-культурным будаўніцтве, здолела таксама стварыць і магутны фізкультурны рух. Гэта знайшло сваё прызнаньне ў тым, што ВСФК СССР рашыў адзначыць юбілей фізкультурнай арганізацыі БССР правядзеньнем усесаюзных спаборніцтваў па цяжкай атлетыцы ў Менску.

Наш юбілей і ўсесаюзныя спаборніцтвы зьявяцца падлікам і аглядам нашых сіл і дасягненьняў, падрыхтоўкай да сусьветнай пралетарскай спартакіяды, якая адбудзецца ў 1934 годзе.

У спаборніцтвах прымуць удзел лепшыя фізкультурныя сілы Савецкага саюзу па барацьбе, боксе, штангі. Прыяжджаюць 10 калектываў з розных рэспублік і абласьцей СССР.

Тое, што ва ўсесаюзных спаборніцтвах у Менску прымуць таксама ўдзел каля 20 рабочых спартсмэнаў з Англіі, Швэцыі, Швэйцарыі, Нарвэгіі падкрэсьлівае інтэрнацыянальны характар нашага сьвята.

Да свайго 10-гадовага юбілею фізкультурная арганізацыя БССР падыходзіць з радам дасягненьняў, у прыватнасьці ў галіне ўзьняцьця спартыўна-тэхнічнай работы і культываваньня новых асобных відаў спорту, як бокс, які ў Беларусі да 1928 г. ня быў вядомы.

За гэты час армія фізкультурнікаў вырасла з 25 тыс., гэта па самадзейным руху, ня лічачы РСЧА і «Дынамо». У перабудове фізкультурнай работы на аснове комплексу «ГПА» Беларусь заняла першае месца сярод саюзных рэспублік. Кантрольная лічба па здачы норм на «ГПА» у 32.000 — перавыканана і значок атрымалі 42 тыс. чалавек.

Але наша задача — ня толькі здаровы пралетарскі спорт. Маса фізкультурнікаў прымае актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, у мерапрыемствах, праводзімых партыяй і ўрадам. 96 проц. фізкультурнікаў — ударнікі.

На фабрыках і заводах, новабудовах, у саўгасах і калгасах, усюды фізкультурнікі, як ударнікі сацыялістычнага будаўніцтва, паказваюць узоры баявой работы.

Наш пазынг «кожны фізкультурнік — лепшы ўдарнік» стаў канкрэтнай праграмай для кожнага фізкультурнага калектыву заводу, цэху. Аб гэтым гаворыць шматлікія факты. На шоўкавай фабрыцы ў Магілеве з 695 фізкультурнікаў — 620 ударнікаў. 6 ударных брыгад выконваюць прамфінплян на 109 проц. Калектыў фізкультурнікаў фабрыкі адпрацаваў на торфараспрацоўках 1.900 працадзён.

Толькі за вазін мінулы год фізкультурнікі ў адказ на заклік партыі адпрацавалі на дарожным будаўніцтве ў БССР 19.000 працадзён. У адказ на пастанову студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК аб шырэйшае фізкультурніцкай арганізаваці эстафэты, у выніку якой сабрана каля 100.000 клгр. ушіпю.

Палітычны твар фізкультурнай арганізацыі БССР, як і ўсяго Саюзу, здаровы, установкі партыі ўсвоены выстарчальна. Мы можам лічыць, што знаходзімся на правільным шляху. У нас ёсьць усе прадпасылкі і могчымасьці для далейшага здаровага росту і разьвіцьця.

Неабходна ўсё-ж сказаць, што рад арганізацый і, у прыватнасьці, калгасныя, сампрамкамандэрацыя недаацэньвае значэньня разьвіцьця фізкультурнага руху ў сваёй сыстэме. Бясспрэчна, што тут вінаі ВСФКБ, які ня здолеў падцягнуць гэтыя адстаючыя вучасткі.

Партыя дала зусім ясныя і выразныя ўстаноўкі аб шляхох разьвіцьця фізкультурнай работы. Гэтыя дырэктывы павінны ажыцьцяўляцца фізкультурнікамі арганізацыямі ў іх штодзённай работе.

Асноўныя з задач — узьняць на вышэйшую ступень якасьць масавай і спартыўна-тэхнічнай работы, культываваць асобныя новыя віды спорту і, у прыватнасьці, аўладаньне комплексам «ГПА» другой ступені і мэханічнымі відамі спорту (аўто, мота, авія, парашуты) і г. д.

Ня менш важнай задачай зьяўляецца таксама стварэньне моцнага фізкультурнага самадзейнага руху ў калгаснай вёсцы. Гэта работа павінна быць шчыльна ўвязана з барацьбой за ўзмацненьне калгаснага ладу, за разьвіцьцё новай культуры ў сацыялістычнай вёсцы.

Гэтым самым мы прыдзем з яшчэ большымі і лепшымі паказальнікамі да надыходзячай сусьветнай пралетарскай спартакіяды.

Алімпіяда самадзей насьці школьнікаў і піянэраў

8 чэрвеня ў клюбе харчавікоў адкрылася першая менская гарадзкая алімпіяда самадзейнага мастацтва школьнікаў і піянэраў. На ёй прадстаўлены ўсе віды самадзейнасьці школ, дзіцячых садоў, піянэратрадаў.

Першы дзень алімпіяды зьявіўся нагляднай дэманстрацыяй вялікіх посьпехаў у разьвіцьці самадзейнасьці пралетарскай дзетвары.

Затхлая атмасфэра старой школы душыла, трымала пад спудам таленты тысяч дзяцей працоўных. Кастрычнік стварыў усе ўмовы для свабоднага разьвіцьця здольнасьцяй і талантаў пралетарскіх дзяцей.

Адзін за другім, сьмела і свабодна выходзілі на сцэну пералоўненай залі дзеці-школьнікі. Кожная менская школа, кожны калектыў паказваў на алімпіядзе, чаму яны навучылі дзяцей, якія здольнасьці разьвілі яны.

Вось шумавы аркестр 1-ай школы. Група вучняў на саматужных рознастайных інструментах выканала рад складаных рэчаў. Цікавы, арыгінальны джаз-банд.

Вось вучань 30-ай школы Гросман на ксілафоне ўласнага вынаходзтва сыграў рад цікавых рэчаў.

Вельмі бліскуча выканаў спаданыя музыкальныя творы сямігадовы скрыпач-вучань музтэхнікуму Майстар.

Солё на віалянчэлі... Беларускія скокі... Сьпевы аб Леніне... «Яблачка» з фізкультурнымі варыяцыямі... Дэкламацыя... Солё на мандаліне... Струнныя аркестры польскага і яўрэйскага дзіцячых дамоў...

Маленькія піянэры і «акцябраты» зьмянялі на сцэне адзін другога.

А на іх з вялікай цікавасьцю глядзелі сотні вачэй школьнай дзетвары. Цёпла і горача сустракалі яны сваіх артыстаў, радавалася іх посьпехам, натхнялі іх.

Дзеці, народжаныя Кастрычнікам, паказвалі вялікія перамогі савецкай працоўнай школы.

Алімпіяда будзе адбывацца чатыры дні. П.

ЦСПСБ аб ходзе падрыхтоўкі да фізкультурнага сьвята

Сакратарыят ЦСПСБ у спэцыяльнай пастанове канстатуе зусім нездавальняючы ход падрыхтоўкі да ўсебеларускага і ўсесаюзнага сьвята фізкультуры і дрэннае кіраўніцтва гэтай справай з боку бюро фізкультуры ЦСПСБ і прэзыдыумаў раду ЦП саюзаў. Асабліва безадказныя адносіны правялі прэзыдыум Менскага гарпрафсавету і ЦП саюзаў гарбарнікаў, працаўсветы, дрэваапрацоўшчыкаў і РДУ.

Слаба разгорнута агітацыйна-масавая работа вакол фізкультурнага сьвята. Гэта работа не ўвязваецца з агульнымі гаспадарча-палітычнымі задачамі, якія стаяць перад фізкультурнымі арганізацыямі, і ўсёй рабочай клясай.

Сакратарыят ЦСПСБ прапанаваў прэзыдыуму Менгарпрафсавету, усім ЦП саюзаў і ФЗМК на працягу трох дзён разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод рабочых, служачых, студэнтаў аб значэньні дзесяцігодзьдзя фізкультурнай арганізацыі БССР і надыходзячага ўсесаюзнага спаборніцтва па цяжкой атлетыцы.

За правал падрыхтоўчай работы да фізкультурнага сьвята прэзыдыуму ЦП саюзу мэдсанпрацы абвешчана вымова.

Сакратарыят ЦСПСБ падкрэсьліў асаблівае палітычнае значэньне праведзімага ў сувязі з юбілеем фізкультурных арганізацый агляду-параду ў Менску і прапанаваў усім ЦП саюзаў забясьпечыць сур'ёзную да яго падрыхтоўку. ЦП саюзаў абавязаны забясьпечыць удзел усіх фізкультурнікаў Менску ў парадзе.

Усім РК ЛКСМБ

На 13 чэрвеня ЦК ЛКСМБ склікае нараду ўсіх сакратароў райкомаў, па мочнікаў палітаддзелаў па камсамолу ў МТС і саўгасах і па асобным выкліку культпропаў РК па пытаньні:

Аб выніках сяўбы і задачах ЛКСМБ у прапалачнай і ўборачнай кампаніях.

Сакратар ЦК ЛКСМБ—ГЕРЦОВІЧ.



У канцы мая перадан у эксплёатацыю цэх паліграфічных машын на заводзе імя Макса Гольца ў Ленінградзе. НА ЗДЫМКУ: адзін з першых лінатыпаў, выпушчаных цэхам паліграфічных машын.

Як у Гомелі „рэагуюць" на скаргі рабочых

(Лист групы рабселькораў)

Справа датычыць работніка Гомельскай газэты «Палеская праўда» тав. Вула, у мінулым рабочага фабрыкі «Праца». Тав. Вул зьяўляўся адным з лепшых ударнікаў фабрыкі, за што быў неаднакі разоў прэміраваны і ўзнагароджан камсамольскім калектывам фабрыкі грамадай героя першай пяцігодкі. Ён актыўны рабкор, раней быў рэдактарам насьценгазэты, а пасьля фабрычнай шматгыражкі. У канцы 1932 году т. Вула вылучылі на работу ў раённую рэдакцыю газэты «Палеская праўда».

Ягчэ ў 1931-32 г. Вул са свайго заработку ў 100-110 руб. выплачваў штомесячна па 25-30 руб. у жылкааперацыю для таго, каб атрымаць кватэру. Але атрымаць яе не давялося, бо пераход на работу ў рэдакцыю газэты «Палеская праўда» стаў перашкодаю.—«Ты ня наш рабочы, мы цябе забясьпечваць кватэрай на будзем»,— заявіў старшыня фабкому тав. Нісенбаум.

Ужо каля двух год Вул са сваёй сям'ёй (5 чалавек: бацька—рабочы Палескай друкарні, матка і дзьве сястры) жыве ў маленькім катушку, дзе днём і ночу гарыць газавая лямпа, бо вакон у гэтай «кватэры» няма.

Тав. Вул у 1919 годзе быў зьлавечан дэнікінцамі на Украіне і застаўся інвалідам. Зараз яму бацькі вочы ад газавай лямпы, якая гарыць бесьпераныпна.

У горадзе ня знойдзецца ні адной арганізацыі, куды-б Вул не зварачаўся за дапамогай. Сацыяльна-бытавы сэктар гарпрафсавету вылучыў камісію для абсьледаваньня яго кватэры. Тое-ж самае зрабіла і РСІ. Некалькі разоў абсьледавала санстанцыя. Вывады ўсіх камісій зводзяцца да адной думкі—кватэра для сям'і Вула незадходна. Але далей канстатаваньня факту ні адна арганізацыя не пайшла.

У сакавіку тав. Вул зьвярнуўся ў рэдакцыю «Праўды» за дапамогай. 23 красавіка «Праўда» пакіравала яго ліст у Гомельскую кантрольную камісію. Кантрольная камісія вылучыла чалавека для абсьледаваньня, які сказаў аналёгічнае таму, што ўжо ня раз гаварылі розныя камісіі. І на гэтым канец. Ліст з «Праўды» і вывады па абсьледаваньні ляжаць у папках бюро скаргаў Гомельскай РСІ, а Вул са сваёй сям'ёй жыве ў той-жа самай кватэры.

26 мая адзін работнік рэдакцыі пераехаў у іншы горад і кватэра яго засталася вольнай. Рэдакцыя рашыла аддаць яе тав. Вулу (гэта кватэра ў свой час была адрамонтавана на сродкі рэдакцыі і па згодзе з сакратаром гарсавету засталася ў распараджэньні рэдакцыі).

Тав. Вул, заручыўшыся згодай сакратара гарсавету тав. Ражнова, атрымаў у гаржыллітале ключ ад гэтай кватэры і завёз туды свае рэчы. Здавалася-б, што на гэты раз справа павінна быць скончана. Але гэта ня так. Раніцай 27 мая старшыня жакту Зысько і члены праўленьня жакту Новікава і Фэльдман зрываюць дзьверы, выкідаюць рэчы Вула і ўселяюць туды рабочага гарбарні. Справа даходзіць да міліцыі, якая ўселяе назад Вула ў кватэру.

Праз пару гадзін Вула зноў выкідаюць з кватэры. І на гэты раз ужо назаўсёды. Аб гэтым паведамілі начальніку міліцыі, пракуратуры і РСІ, якія добра ведалі справу Вула, але нічога ня вышла. Вул застаўся без кватэры.

Ня менш абураючыя адносіны пракуратуры да гэтай справы. Пракурор Мэерзон заявіў: «у мяне ёсьць больш важныя справы і сюды я мяшацца ня буду». Поўную безадказнасьць праявілі партарганізацыі фабрыкі «Праца». У ліцьце групы рабочых гэтай фабрыкі на імя тав. Багановіча сказана: «у мэтах палепшэньня жыцьлёвых умоў рабочых прапанаваць гарсавету пры ўвядзеньні ў эксплёатацыю новага жыльлёвага фонду ўлічыць патрэбы рабочых фабрыкі «Праца». Дырэктару фабрыкі тав. Кагану і Белбудтресту Шэрману вырашыць пытаньне аб пабудове не пазьней першага кварталу 1933 году лёгка-тыпнага дому на 100 чал.». Для гэтай мэты Наркамлёгпрам БССР асыгнаваў 60.000 р. Але сроднкі ляжаць нескарыстанымі. І зараз няма нават праекту новага дому. Партарганізацыі фабрыкі нічога не зрабілі, каб правесьці папісанае ў жыцьцё.

У свой час газэта «Правда» пісала аб безадказнасьці бюро скаргаў Гомельскай РСІ. За гэта загадчык Арап'еў быў зьнят з работы. Але, відаць, і новае кіраўніцтва не зрабіла пералому ў працы Гомельскага бюро скаргаў.

Мы лічым, што ліст тав. Вула прысланы «Праўдой» больш месяца таму назад, павінен даць адпаведныя вынікі і разарваць кола цяганіны і бюракратычных адносін да справы забясьпячэньня жыльлёвай плошчай. Гомельская РСІ павінна зрабіць усё каб тав. Вул у самы кароткі час атрымаў кватэру, а таксама зьнішчыць назаўсёды бяздушныя адносіны да справядлівых запатрабаваньняў рабочых.

Гізунтэрман, Аронаў, Каліміянец, Гоз.

АД РЭДАКЦЫІ:

Талія абураючыя адносіны пасобных Гомельскіх арганізацый да рабочага Вула неацярпімы і патрабуюць тэрміновага рэагаваньня.

«Зьвязда» просіць ЦКК РСІ зацікавіцца гэтаю справаю і пакласьці канец агідным бюракратычным дзеяньням.

АБ ВЫНІКАХ УСЕБЕЛАРУСКАЙ ПАРТ НАРАДЫ ПА ТОРФАПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне Аргінсэру ЦК КП(б)В аб выніках усебеларускай партнарады па торфапрамысловасьці, сакратарыят ЦК КП(б)В адзначае: ня гледзячы на тое, што правялічэньне механізацыі здабычы торфапрамысловасьці ў 1933 г., магчымасьць арганізаванага набору рабочай сілы ў калгасах, значныя капіталаўкладаньні ў торфараспрацоўкі стварэньне ўсе ўмовы для пасьпяховага выкананьня праграмы торфаздабычы ў бягучым годзе як на колькасьці, так і па якасьці — выкінді здабычы першага месяца паказваюць, што як гаспадарчыя (Белторф, дырэкцыя заводу), так і партыйныя і прафсыпнальныя арганізацыі не перабудавалі работу па-новаму, не павялі рашучай барацьбы з косасьцю, з традыцыямі старой арцельнай работы ў кар'ерах, з бюракратызмам у апараце трэсеры, з бюракратызмам у апараце трэсеры, з бюракратызмам у апараце трэсеры і дырэкцыі заводаў і не забясьпечылі сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў па выкананьні пляну здабычы торфу.

Сакратарыят ЦК КП(б)В пастанаўляе:

1. У справе правільнай арганізацыі вытворчасьці і працы абавязаць Белторф (т. Кузьняцова), ЦП саюзу — тав. Гарэгляда і заводкія арганізацыі забясьпечыць неадкладнае правядзеньне наступных мерапрыемстваў:

а) рашуча ліквідаваць характар арцельшчыны ў брыгадах, ператварыўшы брыгаду ў сапраўдную вытворчую адзінку; устанавіць выразнае адзіначальне ў брыгадзе, стварыўшы замест існуючага інстытуту брыгадзіраў і пам. начальнікаў агрэгатаў, пасаду начальніка зьмены, які адначасова зьяўляўся бы адказным за арганізацыю вытворчых нарад, за сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў брыгадзе.

б) перавесьці работу на машынах па ўсіх торфазаводах не пазьней 15-VI на нармальную 8-гадзінную зьмену з перапынкам на абед, забясьпечыўшы ўсе неабходныя ўмовы, асабліва арганізацыю бесьперабойнай дастаўкі харчаваньня да машыны, правёўшы папяраднюю масавую растлумачальную работу сярод рабочых.

г) рэзка павялічыць каэфіцыент карыснай дзейнасьці машыны, забясьпечыць поўную ліквідацыю прастояў па тэхнічных прычынах і бязмоўнае выкананьне ўстаноўленых норм часу для перасоўкі машын шляхам ліквідацыі абзылічкі ў рамонце машын, правільнай арганізацыі тэхнічнага нагляду і плянава-папераджальнага рамонту, правільнай расстаноўкі і арганізацыі працы ў брыгадзе, сыстэматычнага інструктажу і нагляду ў працэсе работы з боку начальніка зьмены і агрэгату.

д) расставіць сілы ў брыгадзе такім чынам, каб поўнасьцю забясьпечыць належнай рабочай сілай кар'еры і не дапускаць ніводнага лішняга рабочага на іншых працэсах, арганізаваўшы сыстэматычны інструктаж, нагляд і абмен вопытам па пасобных працэсах—кар'ер, накладка, зьёмка і г. д.

е) рашуча перайсьці на дробна-групавую зьдзельшчыну ў кар'ерах (2 ч.) і індывідуальную — на астатніх працэсах. У адпаведнасьці з гэтым Наркампрацы, ЦСЛСБ, ЦП Саюзу і Белторфу ў дэкадны тэрмін устанавіць і спусьціць на месцы ў першую чаргу па Асінторф, «Бальшавік» і «Шлях сацыялізму» зьменныя нормы выпрацоўкі для кожнай кваліфікацыі пасобку, расцэнкі і тэхніку ўліку выпрацоўкі. Зарплату рамонтных рабочых і мэханікаў устанавіць у прамой залежнасьці ад зьніжэньня прастояў машын і выпрацоўкі брыгад.

2. У справе тэхнічнага кіраўніцтва:

а) Белторф — т. Кузьняцову ў трохдзённы тэрмін перасунуць на менш 70 проц. спэцыялістаў-торфяніцкіх — будаўнікоў, бухгальтараў на заводы, паставіўшы іх на канкрэтныя вучасткі работы на ўвесь час сезону.

б) НКЦяжпраму, Белторфу і ЦП саюзу ў трохдзённы тэрмін перагледзець у бок спрашчэньня і скарачэньня штатну структуру заводакіраўніцтва, безагаворачна ліквідаваць сыстэму вучасткаў (Асінторф, «Шлях да сацыялізму» і інш.) з тым, каб перасунуць асноўную масу спэцыялістаў і кіруючага складу заводакіраўніцтву на канкрэтныя вучасткі вытворчасьці на ўвесь сезон. Абавязаць усіх астатні кіруючы склад заводзкіх арганізацый ня менш 70 проц. рабочага часу праводзіць на вытворчасьці.

в) наркампрацы ў пяцідзённы тэрмін забясьпечыць перасоўку на вытворчасьць усіх спэцыялістаў і кваліфікаваных работнікаў торфпрамысловасьці, якія зараз не працуюць па сваёй спэцыяльнасьці.

г) у адпаведнасьці з гэтым у мэтах стымуляваньня работы спэцыялістаў на вытворчасьці Наркампрацы, разам з Белторфам і ЦП саюзу, у трохдзённы тэрмін перагледзець стаўкі і сыстэму зарплаты спэцыялістаў торфпрамысловасьці ў бок павышэньня аплаты спэцыялістам, якія працуюць непасрэдна на вытворчасьці.

3. У справе грамадзкага харчаваньня і рабочага снабжэньня:

а) абавязаць заводзкія арганізацыі ўпчыльную заняцца пытаньнем грамадзкага харчаваньня і рабочага снабжэньня, паставіўшы харчаваньне і снабжэньне ў простую залежнасьць ад колькасьці і якасьці працы кожнага асобнага рабочага, супроць подыра, прагульшчыка і лятуна; устанавіць, што старшыня ТРК зьяўляецца намесьнікам дырэктара па рабочым снабжэньні.

б) неадкладна шырока арганізаваць самазагатоўкі, пасіка зьвязаўшыся з вакольнымі калгасамі. Адпаведным РК і РВК аказаць садзейнічаньне ТРК у правядзеньні самазагатовак. Заводакіраўніцтвам у пяцідзённы тэрмін ліквідаваць сваю запазычанасьць ТРК, не дапускаючы кредытаваньня надалей.

в) ВКС — т. Царонку і Ландау у трохдзённы тэрмін правесьці якасны склад кіруючага складу ТРК і разам з аддзелам кадраў ЦК умацаваць яго выпрабаванымі кадрамі. У дэкадны тэрмін праверыць на радзе ТРК стахановішча ўліку захаваньня і выдаткаваньня прадуктаў і прамтавараў, устанавіўшы сыстэму, якая папярэджала-бы разбазарваньне фондаў і злоўжываньні; разам з гэтым партыйным і прафсаюзным арганізацыям арганізаваць на заводах рабочы кантроль над работай кожнага кавярацыйнага вузла (сталовыя і крамныя камісіі, у сьвінарніку, трусятніку і інш.).

4. У галіне арпартмасавай і палітыка-выхаваўчай работы:

а) перанесьці центр цяжару ўсёй работы ў брыгаду і баракі; забясьпечыць правільную расстаноўку партсіл і перасунуць асноўную масу камуністаў і камсамольцаў з апарату і з другарадных работ непасрэдна на вытворчасьць, у брыгаду, арганізаваўшы ў іх парторгаў, адпаведна гэтаму ліквідаваць існуючую структуру партканцэлярыі Асінторф, «Шлях да сацыялізму», «Бальшавік» з карлікавымі штучнымі ячэйкамі і перайсьці на статутную заводзкую парт'ячэйку з тым, каб парт'ячэйка абслугоўвала кожнага пасобнага камуніста і брыгаду праз парторга, прафорга; заставіць партгрупы толькі ў сталоўцы, ТРК і прыгарадных гаспадарках.

б) маючы на ўвазе пасьпяховае складу начальнікаў заводаў, выпрабаванымі камуністамі, даручыць ГК і РК КП(б)В у трохдзённы тэрмін падабраць і адкамандываваць да канца сезону на Асінторф трох камуністаў з Аршанскага РК і 7 з Віцебскага ГК КП(б)В, на «Бальшавік» 10 камуністаў і на «Шлях сацыялізму» — 5 — з Гомельскага ГК, на завод Смалявічы — 4 і «Чырвоны сьцяг — 6 — з Менскага ГК КП(б)В.

в) базай масавай культвыхаваўчай работы ў брыгадзе стварыць барак, арганізаваўшы там па-брыгадна вытворчыя куткі, выпуск брыгаднай насьценгазэты, чытаньне газет, гутаркі, гурткі па павышэньні агульнай і тэхнічнай пісьменнасьці рабочых, увесьці штодзённае правядзеньне па-брыгадна тэхпалітгадзіны; у бараках арганізаваць выбарныя саветы баракаў для арганізацыі самапільнасьці, належных бытавых умоў і культвыхаваўчай работы; лічыць неабходным, каб асноўная маса камуністаў і камсамольцаў праводзіла паказаную работу ў бараках па сваіх брыгадах.

г) асабліва ўзмацніць выхаваўчую работу сярод тарфяніц, апіраючыся на дэлегацыі із-т; па заводах «Шлях сацыялізму», Асінторф, «Бальшавік» — Смалявічы мець у складзе тарфкому сталых жанрагрупаў, на іншых уклась ці гэтую работу на найбольш адольнага камуніста або камсамольца.

д) у мэтах рашучага ўдару сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі, фракцыі ЦСПСБ т. Адам, ЦП саюзу тав. Гарэгляд, разам з Наркаматамі цяжкай і лёгкай прамысловасьці — т. т. Кузьняцову і Грысевічу і рэдакцыі «Рабочай» — Фішбэйн арганізаваць конкурс на лепшую брыгаду і асобна на лепшы торфавод на пераходны сьцяг СНК БССР.

5. У цэнтры ўвагі заводзкіх арганізацый і рабочых паставіць якасьць выпрацоўкі торфу, умацаваць на ўсіх заводах тэхнічны кантроль і бракераж на ўсіх працэсах вытворчасьці; у брыгадах вылучыць грамадзкіх інспэктароў па якасьці і арганізаваць асобную работу з бракаробамі.

6. Для пакрыцьця недавыработкі майскай праграмы абавязаць Белторф і заводакіраўніцтвы не пазьней 10-VI—33 году ўкамплектаваць звыш пляну 16 брыгад і ўвесьці ў эксплёатацыю поўнасьцю плянавую колькасьць машын. Заводам «Варашылава», (т. Дзічкоўскаму) і «Чырвоны металіст» (т. Кагану) аказаць канкрэтную дапамогу ў мантажы і пуску машын.

7. Сакратарыят ЦК КП(б)В адзначае зусім нездавальняючае становішча па лініі Белторфпрамкавэрацыі, ня гледзячы на тое, што гэтая сыстэма займае буйнае месца ў торфаздабычы па БССР. Найбольш буйныя прарывы ю нуюць у справе кавэраваньня сяляцтва — 50—60 проц. патрэбнай работы, арганізацыі прамкалгасаў (9 на БССР), культурнай эксплёатацыі балот і якасьці вырабляемага торфу. ЦК КП(б)В абавязвае ўсе РК КП(б)В неадкладна заняцца работай торфпрамарцелей свайго раёну, ростам кавэраваньня, правільнага зьмяшчэньня і гаспадарчага ўмацаваньня арцеляй.

8. Для практычнай дапамогі ў перабудове ўсёй работы камандыраваць на месяц на асноўныя торфазаводы — Асінторф тав. Фішбэйн — «Рабочы», Смалявічы т. Ігнатовіч — «Бальшавік» — т. Зарэцкі.

Абавязаць таксама НКПр. — т. Абражуласа, НКПр. — т. Грысевіча і ЦПО т. Гарэгляда выслаць на асноўныя заводы групу кіруючых работнікаў, якія разам з дырэктарам адказваці-б за выкананьне прамфінпляну.

3. Бядуля і Крапіва

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЁХ ЛЕПЕЛЬШЧЫНЫ

I.

Сонца толькі што ўстала і глядзіцца ў вялізарнае люстра — Макараўскае возера, не налюбуецца сваім круглым, румяным, як у маладой калгасніцы, абліччам. Бадзёры халадок зганяе з нашых твараў апошнія сьляды сну.

Мы сьпяшаемся на свайго цэнтральнай брыгады. У брыгадзіра Бондала баляць зубы. Уся ніжняя сківіца аж да вушэй захутана ў кажурыну, воўнаю наверх. Шырозная, чорная, як сажа, штучная барада яго падвязана хусьцінкаю. Ён ходзіць па стайні, выбягае на двор, і дае дадатковыя распараджэньні, якіх не пасьпеў аддаць напярэдадні. Палову станкоў мы застаём пустых — найбольш рупныя калгасьнікі ўжо выйшлі на працу. Праходзіць яшчэ поўгадзіны і ў станкох застаюцца толькі два кані. Яны заклапочана паглядаюць у вароты, праз якія выйшлі іхнія суседзі, паварочваюць галавы ў наш бок, і ў конскіх зачох брыгадзір Бондал чытае сабе дакор. Ён хапаецца за сківіцу, праклінаючы і свой зубны боль і ўсіх лодыраў на сьвеце, а больш за ўсіх Стася Арцішэўскага і Пётру Качана, праз якіх ён сёньня пайшоў чырванець. Нарэшце, аж у сем гадзін, яшчэ добра не працёршы вачэй, прыходзіць Стась Арцішэўскі — малады здаровы хлапец.

— Але-ж хедь ты яму кол на галаве чашы, дык усёроўна, — скарджацца Бондал. — Ужо і на сходзе бралі і штрафавалі, нічога не памагае. І брацішак яго Франак такі самы абібок.

А Пётра Качан так і ня прышоў. А палове восьмай брыгадзір аддаў яго каня другому калгасьніку.

Пётру Качана сустрэлі мы трохі пазьней, калі аглядалі пасевы з сакратаром партыйнай ячэйкі тав. Палянскім. Жыве Пётра Качан на хутары; хатка яго стаіць на высокім узгорку, з якога адкрываецца шырокая панарама на ўсход, на поўдзень, на захад. На адлегласьці дзесятку кілёмэтраў сіняя стужка лесу. У шправе зялёнага аксаміту лугоў зьве срэбра вазёр — Макараўскага, Мелкага, Астраўнога. Над абшарам узвышаюцца белыя муры «храмаў боскіх» — былых ісярод-ні чэмны і панскіяй маны, куды за-бітыя і запуханыя сяляне несьлі апошнія капейкі. Цяпер склеп пад Губінскім касьцёлам вельмі прыдуўся для схову калгасных буракоў. У Макараўскай царкве, якая сваім памерам і архітэктурай не падыходзіць для клюбу, калгас ссыпае насеньне, а з Каменскай царквы вышаў ня дрэнны клюб. Цяпер ужо ня толькі ў Каменскім сельсавеце, але і ва ўсім Лепельскім раёне няма ніводнай дзейнай царквы, не засталося ніводнага служкі боскага. Раён суцэльнай калектывізацыі зьяўляецца адначасна і раёнам суцэльнага безбожжа.

Вяз бога і праца старней ідзе. Вунь яны групамі, зьвеньнямі, атрадамі рассыпаліся на ўзгорках і нізінах; у заўзятых баёх за ўраджай, пераворачваюць плугамі, рэжуць «дыюкамі», дзяруць «драпакамі», расчэсваюць спружыноўкамі і «зыт-загамі» плутоўю глеістую глебу. А каля Пётравай хаты, у гарохавым зарасьніку, салаўі аж разьлягаюцца адзін перад адным. Здалёк відаць замацаваны за Пётрам белы конь, цяпер арэ другі калгасьнік. А сам Пётра ў хаце сядзіць, з-за шалёўкі крадкам на нас паглядае: «А ці скора іх чорт панясе адэтуль». Але Пётру не пашанцавала: чорт на той час адлучыўся недзе.

— Годзе табе туляцца ўжо, выйдзі сюды на хвілінку, — кліча Пётру тав. Палянскі.

Падыходзіць Пётра, спускаючы вочы, і здалёк яшчэ пачынае апраўдвацца. Ён, бачыце, авечку сваю хацеў сёньня завесьці на пашу ў Чаросава (суседняя брыгада), дык брыгадзір каня ня даў. А цяпер вось і карову няма як адну пакінуць (карова навязана ў кустох каля хаты, шчыпае сабе траву). Мы абяцаем Пётру напісаць пра яго ў газэту.

І ў мінулым годзе Пётра Качан працаваў слаба, таму і з хлебам у яго цяпер тугавата, але гэта яго мала чаму навучыла. Можа яшчэ спадзяецца на тое, што брат яго родны, Ігнат Качан — старшыня калгасу. Братнае сэрца ня камень, пашкадуе, падтрымае чым-небудзь, — дужае сабе. А Ігнату Качану лепш-бы і ня чуць пра Пётру. Кожны яму братам вока можа ўкалоць. А вока сапраўднае толькі адно ў Ігната і засталося; другое на імперыялістычнай вайне на шкляное прамяняў, ды яшчэ дзесяць раз у прыдачу ўзяў. Як толькі зойдзе гаворка пра брата, Ігнат Качан толькі рукамі разьвядзе:

— Паняцыця ня маю, што гэта за чалавек! Як не адна маці нас нарадзіла. Вось узяць другога брата, Хвядоса, — пра таго нічога дрэннага сказаць нельга. А гэты гультаяваты, праўду трэба сказаць.

І відаць па ўсім, што праўда гэта ня лёгка.

Ня толькі браты Арцішэўскія ды Пётра Качан ганьбяць сёньня імя калгасьніка. Побач з імі трэба ўспамянуць пра такіх, як Браніслаў Агрызка, які яшчэ ў мінулым годзе надзяваў каню хамут клепчамі назад. І сёлета ён выходзіць на работу так, што пакуль пратрэ вочы ды пачухаецца, дык людзі напрацуюцца. А рабіць, што пачне, дык так і глядзі, каб ня прышлося перарабляць. Да ліку такіх «ударных» калгасьнікаў трэба аднесьці і Малахоўскага Яна, і Шлыка Паўла і Ханяка Макара, у якога яшчэ нядаўна была ўлюбёная прыказка: «Дурака работа любіць». Але ўсе яны разам узятыя зьяўляюцца толькі назначным выключэньнем з агульнай масы калгасьнікаў «Чырвонага Сьцягу». Асноўнае патрабаваньне, якое ставіць сёньня калгасьнік старшыні калгасу і свайму брыгадзіру, гучыць вельмі выразна:

— Давай работу!

Тут старшыні ды брыгадзіру трэба толькі ўмець гэту работу даць, трэба ўмець расставіць сілы так, каб работа ішла ня ў пустую, а давала найбольшы гаспадарчы эфект. З гэтага боку не ва ўсіх брыгадах і не заўсёды яшчэ ідзе гладка.

Мы былі сведкамі таго, як старшыні калгасу прыходзілася адбіваць цэлую атаку. Атакавалу яго атрад калгасьніц-бабулек, галоў па 50 і болей. Крыўд на стала бабулькам, што іх маладыя ў работе аб[illegible]ць. Яны-б гатовы яшчэ і пацягаць маладымі, ды ім работы не даюць. Вось сабралася іх чалавек шэсьць, дый прышлі браць у перапыт тав. Качана.

— Што-ж ты, Ігнатка, ужо і за людзей нас ня лічыш? — Чым-жа мы горшыя, што павінны, зложыўшы рукі, дома сядзець?

— Ціха-ця, цёткі, будзе вам работа, — цярэбіца Качан.

— Дзе-ж яна, калі няма.

— Ідзеце да свайго брыгадзіра. Ён жа меўся капец бульбы раскрываць, вось-бы вы і пераралі.

— Учора-ж гэта было, пераралі мы бульбу.

— Я-ж яму казаў яшчэ каменьне з канюшыны пазьбіраць. Можа-б вы і зьбіралі памаленьку, — гаворыць Качан і сам ня ўпэўнены, ці пад сілу ім гэта работа.

— Ды мы і каменьне пазьбіралі ўжо, — наўзахваткі адказваюць бабулькі.

— Вунь маладыя каназы капаюць. Не пасылаць-жа вас на гэту работу, — апраўдваецца старшыня калгасу. — Памагаце бульбу садзіць, каторыя дужэйшыя. А то вось скончым ярыну, за гароды возьмемся. А там і палоць надыдзе пара. Будзе работа ўсім.

Бабулькі нехапя адыходзяцца.

— Калі гэта яшчэ што будзе!

А ў Качана ад такога «пераплёту» твар усьмешкай расьцьвітае.

— Шмат лягчэй стала, — кажа ён. — А то-ж бывала брыгадзіру прыходзілася на хутарох хадзіць ды ледзь ня кожнага сілком з хаты на работу цягнуць.

Аб гэтым пераломе ў сьвядомасьці калгаснай масы гаворыць ня толькі старшыня калгасу, аб ім гаворыць самі калгасьнікі.

Гэты перадом з асаблівай сілай праявіўся сёлета ў час сяўбы. Гэтаму вельмі дапамагло тое, што зімою, у час хлебазагатовак і ізьмазагатовак, бязьлітасна быў зломлен кулацкі сабатаж і паралізавана кулацкая агіт

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Чыстка павінна ўзьняць на больш высокую ступень усю нашу партыйную работу

СПРАВА ГОНАРУ КОЖНАГА КАМУНІСТА

МЕНСК.

На дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава па паперы нібы ўсё зроблена па падрыхтоўцы да чысткі партыі. Было шмат бегаціны, разганяраў, склікаліся сходы, прымаліся пастановы і г. д. Але першы дзень індывідуальнай чысткі камуністаў ячэйкі лесапільнага цэху 6 чэрвеня, а таксама агульны партсход з удзелам усіх рабочых заводу 5 чэрвеня паказалі, што **партканлектыў да чысткі не падрыхтован.**

Партарганізацыя заводу прышла да чысткі сваіх радоў з прарывамі ў выкананьні прамфінпляну. За першую паціднёўку чэрвеня прамфінплян выкананы: лесапільным цэхам на 74,76 проц., мэблевых—33,33 проц., токарным—14,78 проц., скрыначным—80,92 проц., уцільцэхам—53,62 проц., а разам па заводзе на 44,47 проц.

На адкрытым партсходзе 5 чэрвеня былі заслуханы даклад праверкому аб выніках чысткі і справаздача партканлектыву і цэх'ячэек аб праробленай працы. Выступаўшыя ў спрэчках гавылі аб канкрэтных прычынах прарыву ў выкананьні прамфінпляну. Яны вусім правільна падкрэсьлівалі, што прычыны гэтыя—адсутнасьць павароту лівасьці пасобных камуністаў на рашаючых участках, адсутнасьць самапаборніцтва і ўдарніцтва, адсутнасьць гаразрахунковых брыгад, нязма барацьбы за якасьць, шмат браку, асабліва па мэблевым цэху.

Усе гэтыя прычыны, бясспрэчна, можна і неабходна зьнішчыць. На сходзе 5 чэрвеня была прынята пастанова пры аднадушным галасаваньні, і камуністаў, і беспартыйных рабочых заводу аб абвяшчэньні дзесяцідзеньніка штурму па ліквідацыі прарываў. Так, рабочыя парашылі адзначыць пачатак і правядзеньне чысткі сваёй партарганізацыі. Пасьля сходу старшыня праверкому тав. **Гурэвіч** правёў нараду трыкутніка з удзелам сакратароў цэх'ячэек і групарторгаў, дзе завастрыў увагу на важнасьці прынятай пастановы. Усе дружна заявілі: **«Будзе зроблена, заўтра раніцой распачнем».**

Прайшоў дзень 6 чэрвеня, які павінен быў узварушыць усю масу заводу. Прайшоў гэты дзень па-ранейшаму, паціхеньку. Пастанова і запэўненьні засталіся на паперы. Да рабочых пастановы аб дзесяцідзеньні ку ніхто не даводзіў і справа не распачата. Цікава адзначыць, што камуністы, якія праходзілі чыстку 6 чэрвеня: **Ткачук, Лычко, Казак** і інш., таксама ня ведаюць аб дзесяцідзеньніку штурму.

7 чэрвеня пералому ў бок павышэньня актыўнасьці таксама ня было. 10-дзеньнік штурму прарываў практычна ніяк не праводзіцца. У гэты дзень чыстку праходзіў старшыня цэхкому лесцэху тав. **Барташоў.** На запытаньне праверкома, што канкрэтна робіцца па дзесяцідзеньніку, ён вымушан быў адказаць: **«Покуль што нічога».**

Мы ўпэўнены, што партканлектыў у працэсе самой чысткі выправіць свае буйнейшыя прарывы. Дзесяцідзеньнік штурму трэба ўзьняць на прынцыповую палітычную вышыню. Мерапрыемствы па правядзеньні дзесяцідзеньніка павінны стаць баявой праграмай кожнага камуніста. У адзнаку чысткі вывесьці завод з прарыву — справа гонару партыйнай арганізацыі заводу імя т. Молатава. МАРОЗ.

Форма новая, але зьмест стары

БАРЫСАЎ.

З мэтай паладжаньня партыйнай работы, умацаваньня нізавога партвыяна партарганізатарам па ўкаладненьні з Барысаўскім РК КП(б)Б на ст. Барысаў у сакавіку месяцы г. г. была праведзена рэарганізацыя партыйных арганізацый.

Арганізавана базавая ячэйка на правах партканлектыву з вызваленым партработнікам. Пры кожнай службе арганізаваны **зьвеньневыя ячэйкі** або партгрупы. Усяго на вуліцы 3 зьвеньневых ячэйкі і 3 партгрупы.

Здавалася-б, што з гэтай рэарганізацыяй павінна была палепшыцца ўся партмасавая работа. Аднак, замест палепшэньня работы, ёсьць значнае паслабленьне яе ў нізавых партзьвеньнях і партгрупах.

Такое становішча тлумачыцца тым, што рэарганізацыя праведзена фармальна, у новую форму ня ўкладзен новы зьмест. Сакратар базавай партячэйкі т. **Лаўрыновіч** не аддае асноўнай увагі наладжаньню працы зьвеньневых ячэек і партыйных груп.

Па зьвеньневой ячэйцы **шляху з часу арганізацыі базавай ячэйкі** не праводзіцца абсалютна ніякай работы. Пачаліся сэзонныя дарожныя работы, але на бюро ячэйкі і на сходах не абгаворваны задачы камуністаў, у сувязі з гэтым ніякай падрыхтоўчай работы да чысткі партыі па ячэйках не праводзіцца. Гэта пытаньне не прапрацавана нават на ячэйкавым сходзе, не гаворачы аб беспартыйных рабочых. Некаторыя камуністы, як **Шаталеў, Рэут, Ануфрыеў, Тухцін** больш 3-х месяцаў не плацілі членскіх узносаў. Ячэйка горш з уплатай членскіх узносаў па ячэйцы **грузчыкаў.** Камуністы **Мікуўскі А., Макараў, Авечкін, Каратузаў, Сарока, Макаровіч** не плацілі членскія ўзносы па 5 месяцаў і больш. Бюро парт'ячэйкі нават ні разу ня выклікала гэтых камуністаў, каб заслухаць іх тлумачэньні. Таксама ні разу не заслухоўвалася справаздача камуністаў аб іх удзеле ў выкананьні трамфінпляну.

Не працуе партгрупа **Шпалапрапітні,** ня гледзячы на тое, што сам сакратар базавай ячэйкі Лаўрыновіч прымацаваны да яе. Прычына ні разу ня зьбіралася. Ніякай работы па растлумачэньні беспартыйным рабочым заводу задач надыходзячай чысткі партыі не праводзіцца. Бязьдзейнічае партгрупа **ТСТ** і група пры наглядальніку буйнічаў.

Таксама няма зрушэньняў і ў наладжаньні партыйна-выхаваўчай работы. 10-месячную партшколу наведваюць ня больш як 30 проц. камуністаў. Асабліва дрэнна стаіць справа з партвучобай па ячэйцы грузчыкаў. Толькі 3 камуністы наведваюць партшколу, астатнія нідзе не навучаюцца.

Між тым, чыстка партыі па Барысаўскім раёне пачынаецца. Партыйная арганізацыя ст. Барысаў абавязана ў сувязі з гэтым разгарнуць адпаведную падрыхтоўку. Падрыхтоўка павінна даць ажыўленьне партыйнай работы па ўсіх зьвеньнях з тым, каб да чысткі перабудаваць не фармальна, а на сутнасьці. Р.

На сходзе па чыстцы яч. Зльводу (Менск).

БЕСПАРТЫЙНАЯ НАСТАЎНІЦА—САКРАТАР ЯЧЭЙКІ КП(б)Б

— Хто можа быць сакратаром ячэйкі КП(б)Б?

Зазірнем у статут. Яшчэ раз прачытаем пункт № 60: **«Для сакратара ячэйкі абавязковы ня менш чым гадовы партыйны стаж; выключэньні дапускаюцца толькі з санкцыі акругкому (укому) або райкому (у гарадох)».**

Адказ на пытаньне досыць вычарпальны. Ясьней нельга сказаць.

А ці ведаюць аб гэтым у касьцюковіцкім райкоме? Трэба думаць. Ня можа быць таго, што загадчык арганадзелам касьцюковіцкага РК КП(б)Б тав. **Лагуцёнак** ня ведае статуту. Ня можа быць таго, што ён ня ведае, як і каго трэба выбіраць сакратаром ячэйкі КП(б)Б.

Але да чаго даходзяць людзі ў касьцюковіцкім райкоме КП(б)Б? **Сакратаром смольскай партыйнай ячэйкі яшчэ ў лістападзе месяцы 1932 году была выбрана беспартыйная настаўніца тав. Хачкова.**

— Ты-ж, тав. Хачкова, здаецца член партыі?—пытаўся тады тав. Лагуцёнак, які праводзіў выбары сакратара.

— Так. Мяне з кандыдатаў пераняслі ў члены яшчэ ў віцебскім пед'інстытуце,—тлумачыла Хачкова.

— А кандыдацкая картка ёсьць?

— Ды не! Тады-ж на сходзе партыйнай ячэйкі ў інстытуце, калі перавялі мяне з кандыдатаў у члены КП(б)Б, кандыдацкую картку забралі... было гэта, добра памятую, 15 студзеня 1932 году.

— Ніваажна! Ня ў білетах справа! Раз член КП(б)Б, дык мае права быць сакратаром ячэйкі—запэўніў агульны сход тады Лагуцёнак.

І Хачкова — сакратар ячэйкі КП(б)Б.

Так было аж да 7 мая гэтага году. 6 месяцаў беспартыйная настаўніца была на чале ячэйкі КП(б)Б.

С—ў.

Напярэдадні чысткі

Чавусы

Падрыхтоўка да чысткі партыі па раёне амаль не разгорнута, РК КП(б)Б толькі 28 мая вынес пастанову па гэтым пытаньні і больш нічога ня робіць. Упаўнаважаныя райкому па сельсаветах таксама бязьдзейнічаюць.

Па буйнейшых парт'ячэйках раёну: ДУЖАЎСКАЯ (сакратар Хведаровіч), УСУСКАЯ (сакратар Баранаў), ХАЦЕТАЎСКАЯ (сакратар Дашкевіч), МАКРАЦКАЯ (сакратар Мядзьведзеў) і РАДАМСКАЯ (сакратар Варфаламеў) нават пастанова ЦК і ЦКК аб чыстцы не прапрацавана. У парт'ячэйцы Чавускага сельсавету, сакратаром якой зьяўляецца Смаляэцкая, арганізавалі гурток па павышэньні палітведаў, але ён да работы яшчэ не прыступіў.

Толькі ячэйка КАЛГАСУ ІМЯ КАЛІНІНА, сакратаром якой зьяўляецца МАЛКЕЛЬ, пастанову ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы прапрацавала на сходзе парт'ячэйкі сумесна з беспартыйнымі. Гурток для вывучэньня статуту, праграмы і апошніх пастаноў партыі займаецца акуратна раз у пяцідзёнку.

Белта.

Клімавічы

Партыйная арганізацыя да чысткі сваіх радоў рыхтуецца дрэнна. Пастанова партыі аб чыстцы не даведзена да шырокіх працоўных мас раёну. Агульны партдзень па прапрацоўцы пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы ў большасьці ячэек сарваны.

Асабліва дрэнна ідзе падрыхтоўка да чысткі ў ЛАЗОВІЦКАЙ парт'ячэйцы. Гэтая ячэйка—самая вялікая ў раёне. У ёй налічваецца 9 членаў і 7 кандыдатаў партыі, але з іх толькі 6 непасрэдна працуюць на вытворчасьці. У калгасе «Камінтэрн» брыгада камуніста ПАНКАВА—самая адсталая. Адстае і брыгада камуніста КРУПІКАВА. На работу яны выходзяць а 8-9 гадзіне. Коні і сельгасінвэнтар у іх брыгадах абязьлічаны. На вучастку ЎЗЬДЗІВІЧЫ, дзе працуюць камуністы ЖАРЫКАЎ М. І ТАЎКАЧОЎ, 18 га вусу засеяна непратручаным насеньнем. У калгасе імя БЛЮХЕРА, старшыня якога член партыі ПРУДНІКАЎ, не хапае насеньня бульбы і іншых культур.

Бязьдзейнічае і старшыня сельсавету ГРУШАКОЎ. Сэкцыі сельсавету не працуюць. Кулацка-заможныя гаспадаркі, якія сабатуюць сяўбу, не прыцягнуты да адказнасьці.

У ячэйцы вусім слаба разгорнута партыйна-масавая работа. Важнейшыя пастановы партыі і ўраду не даводзяцца да шырокіх мас. Большасьць камуністаў слабапісьменныя, аднак палітвучоба ў ячэйцы не праводзіцца.

Белта.

ПАСТАНОВА ЦК—ПРАГРАМА НАШАЙ ПЕРАБУДОВЫ

У другой палове красавіка месяца г. г. сакратарыятам ЦК КП(б)Б была прынята пастанова аб рабоце нашай партыйнай ячэйкі (калгас «Пралетары», Капыльскі раён). Гэта пастанова стала палітычнай і практычнай праграмай нашай работы і, дзякуючы таму, што мы здолелі хутка мабілізавацца на яе рэалізацыю, мы можам сёньня заявіць, што мы сапраўды перабудаваліся тварам да вытворчасьці і своячасова справіліся з веснавымі сельскагаспадарчымі работамі.

Пастанова ЦК вусім правільна і своячасова на прыкладзе нашай ячэйкі паказала недахопы работы калгасных ячэек. Галоўным нашым недахопам было тое, што мы мала займаліся справамі вытворчага жыцьця калгасу, не вялі партыйна-масавай работы ў брыгадах. Калгасам мы кіравалі «наогул», а не канкрэтна.

Толькі пасьля пастановы ЦК КП(б)Б наша парт'ячэйка стала на шлях бальшавіцкай перабудовы сваёй работы. Пастанова была шырока прапрацавана на адкрытым партыйным сходзе, а пасьля гэтага мы пачалі праводзіць канкрэтныя мерапрыемствы, якія былі ўказаны ў пастанове. Першае, што мы зрабілі —гэта правільна расставілі камуністаў па брыгадах і ў некаторых брыгадах арганізавалі партгрупы.

У брыгадзе № 3 парторг **Эпштэйн.** Разам з Эпштэйнам тут працуюць камуністы **Прахарэнка, Сытнеў, Сізрановіч і Варанцоў,** якія складаюць партгрупу.

Брыгады паміж сабой спаборнічалі ўвесь час сяўбы. Брыгада т. **Дзюба** спаборнічала з брыгадай т. **Арабеля** (парторг Нікіта) і з брыгадай тав. **Эпштэйна.** Спаборнічалі паміж сабой і пасобныя камуністы і камуністы з беспартыйнымі калгаснікамі.

У кожнай брыгадзе ёсьць свая брыгадная газэта, якая забясьпечана партыйным кіраўніцтвам і акуратна выпускаецца раз ў пяціднёўку. Апрача гэтага выходзіць агульная калгасная газэта. У кожнай брыгадзе ёсьць **чырвоная дошка** для лепшых ударнікаў і **чорная** для гультаёў.

Партыйная ячэйка дала кожнаму камуністу партыйную нагрузку, ахапіўшы ўсе галіны работы партыйным кіраўніцтвам, як палявыя брыгады, работа з ударнікамі, ячэйка ЛКСМБ, нізавы друк і г. д.

Значна перабудавалі сваю работу камуністы, аб якіх было сказана ў пастанове. Так, напрыклад, **Прахарэнка** нормы па сяўбе перавыконваў: замест высеву нормы ў 4 гектары, сеяў 6 га, па ворыве замест нормы ў 0,65 га заворваў 0,70-0,75 га. **Варанцоў, Яўсюк** і інш., аб якіх было ў пастанове, таксама перабудоўваюць сваю работу.

У выніку такой праробленай працы калгас 7-га мая закончыў сяўбу збожжавых культур. 17-га мая скончыў сяўбу поўнасьцю па ўсіх культурах.

Зараз парт'ячэйка, не аслабляючы тэмпаў, рыхтуецца да прапалачнай кампаніі.

Члены бюро ячэйкі КП(б)Б калгасу «Пралетары» **Ламакін, Гірко, Макаўчык.**

Бяз штурвала машына ня пойдзе



На Растоўскім заводзе «Ростсельмаш» затрымліваецца выпуск гатовых камбайнаў з прычыны сыстэматычнай непадачы дэталяў з валальска-прасавага заводу і дрэваапрацоўчага камбінату. Зусім гатовыя, сабраныя камбайны застаюцца ў цэхах з-за адсутнасьці штурвалаў, бачноў, левых гаек Кардана і сьцяжных прутоў.

На здымку: Сабраны камбайн бяз... штурвала

Рэалізацыя пазыкі „Другая пяцігодка"

Разгортваньнем масавай работы, грамадзкім буксірам перадавікоў ліквідаваць адставаньне аднаасобнага сэктару

4,7 ПРОЦ.

План рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі па вёсцы выкапан у БССР на 55,5 проц. Асабліва дрэнна ідзе падпіска па аднаасобным сэктары, дзе заданьне выкавана толькі на 4,7 проц. Ёсьць раёны — Лёзьнянскі, Сеньненскі, Асьвейскі, Талачынскі, Бешанковіцкі, дзе сярод аднаасобнікаў не рэалізавана ні аднаго рубля.

Асабліва адстаюць па рэалізацыі пазыкі на вёсцы наступныя раёны: Быхаўскі, які выканаў 51 проц. заданьня, Сіроцінскі — 50,7 проц., Церахоўскі — 50,3 проц., Сурасні — 46,1 проц., Клічаўскі — 45,2 проц., Уваравіцкі — 41,6 проц., Бешанковіцкі — 39 проц.

УДАРНІК РЭАЛІЗАЦЫІ

ЦЕЖАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ, ВУЗЬДЗЕНСКАГА РАЕНУ ПЕРАВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ. ВЯЛІКАЯ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА ПРАВЕДЗЕНА СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ.

САКРАТАР СЕЛЬСАВЕТУ ТАВ. ЛОЙКА ПРАДАЎ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ ЗА НАЯЎНЫ РАЗЬЛІК АБЛІГАЦЫЙ ПАЗЫКІ НА 2.000 РУБ. І САБРАЎ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ НА 6.000 РУБ.

К.

Бярэце прыклад

Макранскі сельсавет, Чырвона-Слабодзкага раёну шырока разгарнуў работу па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі сярод працоўных аднаасобных гаспадарак.

Пытаньне гэта абгаворана на пашыранай нарадзе актыву сельсавету разам з дэпутацкімі групамі. Пасьля нарады некаторыя дэпутацкія групы зараз-жа актыўна ўключыліся ў кампанію і за кароткі час дабіліся даволі бліскучых вынікаў па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў.

Напрыклад, дэпутацкая група вёскі Макраны на аснове правядзеньня штотыднёвай палітычна-масавай работы рэалізавала пазыку сярод аднаасобніка сэктару на 2.300 рублёў. Пораказамі ў набыцьці аблігацый другой пяцігодкі зьяўляюцца аднаасобнікі Пуляи Д., які набыў пазыкі на 50 рублёў, Кісель П.—на 50 руб., Сянюк Л.—на 50 руб., Сянюк Д.—на 40 руб. і г. д.

Дэпутацкія групы ўсіх сельсаветаў, бярэце прыклад з работы макранскай дэпутацкай групы!

Рат.

ЗНОЎ ЧУТНЫ ЗНАЁМЫЯ МАТЫВЫ

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

320.000 руб. і 930 руб. Параўнаньне гэтых дзьвюх лічбаў — кантрольнага заданьня па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў і фактычна атрыманай сумы — характарызуе работу мясцовых арганізацый сярод аднаасобнага сэктару.

Па сельсаветах Магілеўскага раёну падпіска на пазыку за пазыны разьлік фактычна не пачалася. Асноўная прычына такіх ганебна-шаруных тэмпаў у тым, што большасьць сельсаветаў не разгарнула масавай работы сярод аднаасобнікаў. Возьмем Княжыцкі сельсавет — самы буйны ў раёне. Там да 5-га чэрвеня рэалізавана 25 руб. Намесьнік старшыні сельсавету тав. Захаранка, які адказвае за рэалізацыю пазыкі, сядзіць у канцылярыі і чакае, калі ўпаўнаважаныя аднаасобнікі прыдуць падпісацца. Тое-ж наглядаецца ў Палыкавіцкім і іншых сельсаветах.

Старшыня Махаўскага сельсавету тав. Памігаў і сакратар парт'ячэйкі Капылаў знайшлі «сур'ёзнае» тлумачэньне дрэннага ходу рэалізацыі: яны бачыце, заняты сяўбой, — «пакончым з сяўбой, тады возьмемся за пазыку». Нікуды ня варты такія разважаньні! Час пакончыць з даўжэ асуджанай тэорыяй чарговасьці кампаній! Трэба ўмець злучыць важнейшыя задачы партыі на вёсцы.

Бюро райкому прапанавала ўсім упаўнаважаным РК і РВК па пасеўнай кампаніі адпачасова з сяўбой разгарнуць масавую работу па падпісцы, каб да 25 чэрвеня поўнасьцю скончыць яе. Адмак, дырэктыва райкому застаецца на паперы. Ні адзін з упаўнаважаных нічога не зрабіў, каб узмацніць тэмпы рэалізацыі пазыкі.

Нічога ня робяць шэфскія арганізацыі, якія адказваюць за падпіску па аднаасобным сэктары. Шоўкавая фабрыка, якая першай у горадзе скончыла падпіску, абавязалася да 25-та мая скончыць рэалізацыю ў падшэфным сельсавеце. Аднак, дагэтуль заданьне па падшэфным Бялынецкім сельсавеце выкавана толькі на 5 проц. Шэфы забылісь аб сваім самаабавязацельстве. Такі-ж малюнак на заводзе імя Сталіна, па шэфнай фабрыцы, па заводзе «Адраднікопець» і інш.

Нэйдлін.

ЗАБЫТЫ ВУЧАСТАК ПАДПІСКІ

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

З посьпохам скончыўшы рэалізацыю пазыкі другой пяцігодкі па горадзе і па калгасным сэктары, віцебскія арганізацыі супакоіліся і зусім забылі аб існаваньні аднаасобнікаў, аб тым, што па аднаасобным сэктары трэба рэалізаваць пазыкі на 185 тыс. руб. Да 4-га чэрвеня сярод аднаасобнікаў прадана аблігацый толькі на 3.692 руб., што складае 2 проц. заданьня.

Што зрабілі мясцовыя арганізацыі, каб пашпурхнуць рэалізацыю пазыкі па вёсках, сельсаветах. Не гата «вычарпальны» адказ дае кіраўнік гарадзкой апчадкасы тав. Бабіцкі: «Выпусьлі пастановы, гарком і гарсавет пасылалі людзей, але процант выкананьня заданьня настолькі мізэрны, што няма сэнсу падлічваць». Лепш ня скажаш. Кіраўнік апчадкасы гэтым расьпісаўся ў безапамоцнасьці мясцовых арганізацый. Яны абмежаваліся агульнымі дэкларацыямі і голымі рэзалюцыямі. Вось прыклады.

Па Даўжанскім сельсавеце сярод аднаасобнікаў прадана аблігацый на 20 руб. замест 5.040 руб., на Вусьлянскім — на 50 руб. замест 6.400 руб. Рэкорд бязьдзейнасьці набіў Самоцкі сельсавет, які атрымаў заданьне ў 13.800 руб. і не рэалізаваў ні аднаёй капейкі.

Старшыня Даўжанскага сельсавету Гудак энергічна «аб'ектыўную прычыну», каб апраўдаць зрыў падпіскі. Ён гаворыць, што паколькі ўсе сілы кінуты на сяўбу, няма часу правесьці рэалізацыю. Гэта «прычына» толькі шырма, за якой людзі хаваюць сваю бязьдзейнасьць і палучэньне працаваць.

БАЛЬШАВІЦКАЯ ІДЭЙНАСЬЦЬ—НЕАДЛУЧНАЯ ЯКАСЬЦЬ КАМУНІСТА

Наша партыя заўсёды была моцнай ідэйнай загартаванасьцю, самаахвярнай адданасьцю справе пралетарыяту, непрымірнасьцю да ўсялякіх ідэйных хістаньняў, жалезнай дысцыплінай у сваіх радох. Нягледзячы гэтыя якасьці забясьпечылі нашай партыі несакрушальны аўтарытэт у масах. Прыпамятайце яркі вобраз бальшавіка-падполь шчыка, графсьпіналга-рэвалюцыянэра пра якога пісаў Ленін, — пісьменна арганізаваўшага рабочую клясу, уносіўшага рэвалюцыйную сьвядомасьць у рабочую масу, якая падымалася супроць уціску капіталу.

Гэтыя якасьці ленінцы прадстаўнікоў старога пакаленьня бальшавікоў перадаваліся сотням і сотням тысяч партыйцаў, уступіўшых у партыю ў эпоху дыктатуры пралетарыяту. Пад кіраўніцтвам **Леніна і Сталіна** расла і ўмацоўвалася наша вялікая партыя, убіраючы ў сябе ўсе лепшыя, перадавыя элементы рабочае клясы.

Іменна гэта **ідэйнасьць у рабоце, адданасьць справе пралетарскай рэвалюцыі** цягнулі масы за бальшавікамі на фронтах грамадзянскай вайны і на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Сапраўдны бальшавік гарыць на рабоце, не шкадуючы сваіх сіл, заражаючы апружаючых сваім энтузіязмам, самаахвярнай работай на карысьць камуністычнаму, пакаяваючы прылад сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Ведаючы асноўу **рэвалюцыйнай тэорыі,** пэрспэктыў нашай барацьбы робіць адданага партыйцу яшчэ больш устойлівым, яшчэ больш загартаваным, ідэйна ўзброенае яго для барацьбы з праўдашукамі, для ўзьдзеяньня на тых, што хісталіпа.

Вось чаму партыя ў часе чысткі сваіх радоў, прапаноўчы адданасьць кожнага партыйца на яго рабоце, адданасьць пралетарскай ідэйнасьці, адарыта адмовіцца — бо яго-ж адразу выкрыюць як апартуніста!). Яны для выгляду яго прымуць, каб на справе яго сарваць, а потым злосна хіхікаць і балбатаць паконт «перэльтнасьці» і «неажыцьцёўнасьці» гэтых пляцаў.

Іменна такія апартуністы і двурушнікі партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны сталі сабатаваць правядзеньне ў жыцьцё важнейшай пастановы ЦК і СНК ад 8 красавіка пра Данбас, імкнучыся захаваць бюракратычна-канцылярскія мэтады кіраўніцтва вугольнай прамысловасьцю. Партыя, выцямка, зломіць іх супраціўленьне, не аслабляючы барацьбы з усімі, ад каго патыхае «душком» сабатажу.

Але чым вытлумачыць факт такога супраціўленьня, як ня тым, што гэтых людзей не запальвае, не натхняе і ня рушыць наперад жывітная і магутная сіла нашых ідэй, ідэй камунізму, што ў глыбіні душы ў іх павялічна «чарвячок сумненьня». А калі гэта так, то толку ад работы такіх «камуністаў» будзе мала, карысьці для пралетарскай дзяржавы ня будзе.

Нямала працуючымі адсутнасьці ідэйнасьці ў рабоце можна сустрэць і ў вёсцы. Тут у нас таксама ёсьць партыйцы, якія, закасаўшы рукавы, па-бальшавіцку арганізуюць новую, калгасную вёсну, укараняюць там ідэі пралетарыяту, самаахвярна працуюць над сацыялістычнай пераробкай вёскі, над перавыхаваньнем саляк-калгаснікаў. Але разам з тым, трэба сказаць, што значная частка вясковых камуністаў не пазбаўлена яшчэ дробна-ўласьніцкай ідэалёгіі, дробна-буржуазнага цільву. І таму ў радзе вёсак і раёнаў, дзе кіпіць завостраная клясавая барацьба, некаторыя камуністы і нават некаторыя ячэйкі трапляюць проста ў палон да кулака, замыкаюцца ў ім.

У момэнты асабліва завостраных клясавай барацьбы (сяўба, збожжазагатоўкі і г. д.) тут выяўляецца шмат жулікаў з партбілетам у кішэні, іхскрозь гнілых элементаў (даволі хоць-бы ўспомніць аб многіх вясковых арганізацыях на Паўночным Каўказе!).

Вялікая і адказная роля камуніста, як ідэйнага кіраўніка і правадыра мас. Кіраўнік павінен ісьці наперадзе мас, далей і лепш за іх бачыць, больш і лепш за іх ведаць. Бальшавікі адрозьніваюцца ад меншавікоў, гэтых прапаведнікаў «хвасьцізму», таксама і тым, што яны ня цягнуцца ў хвасьце мас, а кідуць іх за сабой. Не пагоня за тэмпай папулярнасьцю, не жаданьне спадабацца публіцы, не меншавіцкае падпярываньне на настроях адсталасьці характарызуюць сапраўднага бальшавіка. Бальшавік павінен ісьці і супроць плыні, умець і супроць шэрсьці гладзіць, калі гэтаго патрабуюць акалічнасьці.

Бальшавік правяраецца цяпер на практычнай рабоце. «Зараз самаахвярнасьць, адданасьць, дысцыплінаванасьць члена партыі правяраюцца не па агульнай яго «прынцыповай» згодзе з генэральнай лініяй партыі, а на канкрэтнай барацьбе за матэрыяльны зьмест генэральнай лініі, за ажыцьцяўленьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва» (Наганович).

Чыстка партыі ва ўмовах другой пяцігодкі, калі перад партыяй стаяць новыя, складанейшыя задачы, будзе новай праверкай згуртаванасьці нашых радоў. Чыстка яшчэ раз пакажа пралетарам нашай краіны і ўсяго сьвету, якія справядлівы лічаць нашу партыю сваёй, роднай партыяй, што ў яе сталёвых радох знаходзяцца дзесяткі і сотні тысяч непатэйных рэвалюцыянэраў, самаахвярных барацьбітоў за справу камунізму.

Чыстка разам з тым укорыце, выкрые і выкавіць партыю ад усіх клясава-чужых і варожых элементаў, ад двурушнікаў, ад адкрытых і скрытых папушальнікаў жалезнай дысцыпліны партыі і дзяржавы, ад перадраўжэнцаў, кар'ерыстаў, шкурнікаў, бюракратаў і ад усіх, што марылі разлажыліся, ад усіх элементаў, якія пэцкаюць сьцяг партыі.

У новых умовах, калі сацыялізм перамог на ўсёй лініі, калі мы дабіваем рэшткі кулацтва, і яны, гэтыя рэшткі пэмфаючых клясаў, бачачы сваю пагібель, шалёна супраціўляюцца нашай справе, — зараз, больш чым калі-б там ні было, нам патрэбна ідэйнасьць у рабоце, нам патрэбны стойкія бальшавікі, людзі, з асабліва-га матар'ялу зробленыя, з чыстай сталі як-бы вылітыя. І такі ідэйны камуніст павінен ісьці наперадзе мас, весьці палітыку **простай і рэзкай праўды,** быць непрымірымым да колсавага ворага і яго агентуры. **Партыя, як поўнаўладны гаспадар, патрабуе ад усіх, што стаяць у яе радох, сумленнасьці і праўдзівасьці, ідэйнасьці і адданасьці, жалезнай дысцыпліны, бязумоўнага веданьня па сутнасьці сваёй вытворчай работы, правядзеньня кожным выразнай прынцыповай лініі на даручаным яму участку.**

Член партыі, які ўпадае ў сум, праяўляе аслабленьне энэргіі ў напружанейшай барацьбе ў нашу вялікую эпоху будаўніцтва камунізму, — такі камуніст, такі «рэвалюцыянэр», ні к чорту ня годны. «Нам гістарычныя шарывы не патрэбны. Нам патрэбны мерны поступ жалезных батальёнаў пралетарыяту» — вучыў партыю Ленін. І яны — гэтыя батальёны — будуць крочыць да новых бояў і да новых перамог пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і яе правадыра тав. **Сталіна.**

Гэтыя батальёны маюць права гаварыцца тым, што на іх [illegible] выпала прайсьці рашаючыя [illegible]ураваую і грандыёзную эпоху, прайсьці пад непасрэдным правадырствам найвялікшага пралетарскага правадыра, прадаўжальніка вялікай справы Маркса і Леніна, справы, якая ўжо моцна заваявала адну шостую частку зямлі і якой немінуча суджана заваяваць увесь сьвет.

(«ПРАВДА»).

МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ ПРАЛЕТАРЫЯТУ

Зўрапэйскі антыфашысцкі кангрэс скончыў сваю працу

ПАРЫЖ, 7 (Белта). Пасьля Дарыё на эўрапэйскім антыфашысцкім кангрэсе выступіў прадстаўнік саюзу лёндонскіх докераў, які прапанаваў стварыць фонд антыфашысцкай барацьбы ў памерах 1/4 млн. марак. Прадстаўнік лёндонскага саюзу мэбельшчыкаў перадаў германскай дэлегацыі чырвоны сьцяг. Кангрэс суправаджае гэты акт в вялікім уздымам і са сьпевам «Інтэрнацыянала». Многія дэлегаты-сацыялісты выступілі в выкрываньнем сацыял-фашысцкіх лідэраў.

Марсэль Кашэн выступіў з вялікаю прамовою, прысьвечанай фашызму і росту ваеннай небясьпекі.

«Немагчыма адмаўляць — гаворыць Кашэн — што небясьпека вайны ажыцьвіцца ў сувязі з тым, што ў некаторых краінах фашызм прыйшоў да ўлады. Антыфашысты, напаўрэальна, знаходзяцца ў авангардзе антываеннай барацьбы».

У заключэньне Кашэн гаворыць, што сацыялістычныя масы павінны патрабаваць ад сваіх лідэраў адмаўленьня ад галасаваньня ваенных бюджэтаў, што ў барацьбе супроць фашызму «ня можа быць адзінства ні з буржуазіяй, якая рыхтуе вайну, ні з тымі з не саюзьнікаў, якія рыхтуюцца, як у 1914 г., адра даць рабочай клясе».

Пасьля прамовы Кашэна і выступленьня чэхаславацкага, румынскага і італьянскага дэлегатаў старшыня кангрэсу агалосіў паведамленьне аб прыгаворы, вынесеным швэйцарскім судом удзельнікам антыфашысцкай дэманстрацыі ў Жэнэве. Кангрэс, стоячы прапеў «Інтэрнацыянал» і пастанавіў пасылаць швэйцарскаму суду тэлеграму пратэсту.

Кангрэсам атрымана некалькі сот тэлеграм, якія сьведчаць аб вялізарным водгуку, які знайшоў кангрэс сярод працоўных усяго сьвету. Старшыня агалеціў тэлеграму Рамэна Раляна з прывітаньнем і выказам сымпатыі кангрэсу. Прыехаўшы з Італіі сялянін Новарээзе, прысуджаны да пяці год турмы, у сваім выступленьні выкрываў дэмагогію італьянскіх фашыстаў і падкрэсьліваў нячуваную галечу італьянскіх сялян. Французкі сялянін Фрусар указаў на неабходнасьць антыфашысцкай прапаганды ў вёсцы і цеснага саюзу паміж пралетарыятам і сялянствам.

Вайян Кутур'е і прадстаўнікі кампартыі Германіі агалосілі агульную дэкларацыю германскай, французкай і польскай кампартыі. Гэта дэкларацыя была падтрымана дэлегацыямі кампартый Бэльгіі і Чэха-Славакіі. У дэкларацыі выказваецца салідарнасьць германскага, французкага і польскага пралетарыяту ў барацьбе супроць фашызму. У дэкларацыі далей падкрэсьліваецца небясьпека вайны і неабходнасьць супольнай барацьбы для абароны СССР ва перамогу міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі, за перамогу сацыялізму ва ўсім сьвеце.

Ад імя французкай асацыяцыі міжнароднай арганізацыі рэвалюцыйных пісьменьнікаў і дзеячоў мастацтва выступіў Вайян Кутур'е. Затым выступіў Фляманд зкі дэлегат, а таксама польскі камдэпутат Розэнбэрг, які адзначыў страшэнную беднасьць польскіх рабочых і сялян. Германскі дэлегат Бэрнгард, цісьнучы руку Розэнбэргу, вітаў яго выступленьне, як праяўленьне міжнароднай салідарнасьці.

Выступіўшы прадстаўнік македонскага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху спыніўся на фашысцкіх мэтадах рэпрэсій супроць нацменшасьцяй шляхам зьнішчэньня рэвалюцыйнага авангарду.

Прадстаўніца ангельскай лейбарысцкай партыі ўказала, што кангрэс зьяў ляецца рабочым адказам на выступленьні нацыянал-сацыялістаў у Англіі.

Учора ў другой палове дня эўрапэйскі антыфашысцкі кангрэс скончыў сваю работу.

Зьняць ганебную пляму з ф-кі „Сьцяг індустрыялізацыі", палепшыць якасьць прадукцыі

ВІЦЕБСК.

Буйнейшая ў БССР швэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» апынулася ў глыбокім прарыве. З месяца ў месяц прарыў паглыбляўся і ў сучасны момант прыняў пагражаючы характар для ўсёй фабрыкі. Аб гэтым сьведчаць наступныя паказальнікі:

У першым квартале па пляну фабрыка павінна была выпусьціць гатовай прадукцыі на 9.169.300 руб. Фактычна было выпушчана на 7.034.700 руб., што складае 76,7 проц. пляновага заданьня.

У красавіку месяцы крывая выканаўчага праграмы скацілася яшчэ ніжэй. Замест 3.757 300 руб. прадукцыі выпушчана на 2.192.600 руб.— 58,4 проц. Май ня толькі не пакрыў прарыў папярэдніх месяцаў, але яшчэ больш яго паглыбіў. Прамфінплян фабрыкай выкананы усяго толькі на 54,7 проц., прадукцыі выпушчана на 1.975.400 руб. замест 3.612.900 па пляну. Такім чынам, за 5 месяцаў сваёй работы фабрыка недадала дзяржаве прадукцыі на 4.336.800 руб.

Гэта — колькасныя паказальнікі. Якасныя—яшчэ больш ганебныя. Даволі ўказаць на тое, што за першы квартал і красавік месяцы з выпушчаных 152.891 пінжакоў забракавана 29.219 штук. Тое-ж самае і па іншых адзінках. З выпушчаных 362.117 пар штаноў, бракаваных аказалася 30.132 пары. Асабліва нябывалыя размеры браку мелі месца ў цэху палітo. За гэты-ж час цэхам палітo выпушчана 88.120 палітo, з іх бракаваных 16.708 штук. Такіх ганебных лічб фабрыка ня бачыла нават у часе не пускавога пэрыяду.

У чым справа? Дзе прычына таго, што адна з буйнейшых швэйных фабрык у СССР і самая буйная ў Беларусі апынулася ў такім незвычайна цяжкім становішчы.

Адказ адзін. Гора-кіраўнікі фабрыкі ў особе яе дырэктара Кагана, сакратара парткалектыву Шыфрына і старшыні фабкому Жутчанка ня толькі не кіравалі фабрыкай, але фактычна зьяўляліся роўнадушнымі назіральнікамі ўсіх агідпасьцяй, моўшых месца ў цэхах.

Яны добра ведалі, што плянаваньне тэхналёгічных працэсаў вытворчасьці праводзіцца направільна, а часта зусім адсутнічае. Яны добра ведалі, што сотні гарнітураў і палітo штодзённа прыводзіцца ў негоднасьць, што з бракаробамі барацьба не вядзецца. Яны добра ведалі, што загадчык цэхам палітo Давыдовіч, старэйшыя майстры Есельсон і Нямчонак стаяць не на сваім месцы, а кантралёры Лахін, Гейдзін і інструктары Калускі і Гапееў, якія падначалены ім, штомінутна прапускаюць бракаваную прадукцыю, ня сочаць за якасьцю.

Ведалі, але ніякіх мер ня прымалі. Сваёй апартуністычнай бязьдзейнасьцю гора-кіраўнікі фабрыкі давялі да таго, што пастановай Наркамлёгпраму СССР закрыт цэх палітo, дзе затрымкі прадукцыі, у большасьці сваёй бракаванай, дасягнулі звыш 20.000 комплектаў.

Фабрычная і цэхавая адміністрацыя, асабліва цэху палітo, ня прыслухоўвалася да голасу рабочых—лепшых ударнікоў, якія не адзін раз заяўлялі, што да злосных бракаробаў Буланавай, Багарад, Хэйфец, Сьмірновай і Садоўскай інструктары Крупенін, Голанд і інш. ня прымаюць ніякіх мер. Нікому ня было справы да таго, што рабочыя, прыйшоўшы на работу, гадзінамі сядзелі без справы і толькі за пару гадзін да сканчэньня зьмены пачынаюць паступаць аэрацыі па канвееры і тады пачынаецца гонка работы. Такіх фактаў можна прывесьці колькі хочаце.

Трыкутніку ня раз былі прапанаваны канкрэтныя мерапрыемствы па іх зьнішчэньні, але пастанова гаркому не знайшла свайго канкрэтнага ажыцьцяўленьня. Свае неадпаразовыя абяцаньні ліквідаваць прарыў апартуністы ператварылі ў пустую дэкларацыю. Яны проста ашуквалі партыю.

Пастановай гаркому дырэктар фабрыкі Каган і сакратар парткалектыву Шыфрын зьняты з работы. Старшыня фабкому Жутчанка атрымаў вымову. Дырэктарам фабрыкі назначан былы дырэктар Белшвэйтрэсту—т. Калабкоў.

Новае кіраўніцтва ўжо адчуваецца. Уся ўвага зьвернута на хутчэйшы пуск цэху палітo. Ужо перагледжан увесь склад рабочых цэху. На ўсе адказныя аперацыі пастаўлены рабочыя з вялікай кваліфікацыяй. Перагледжан увесь склад адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу цэху. Менш кваліфікаваныя інструктары заменены больш кваліфікаванымі. Зьменен і ўзмоцнен таксама склад старэйшых майстроў і кантралёраў.

У тэхналёгічны працэс дадана 18 аперацый у мэтах якаснага паляпшэньня выпуску палітo. Перагледжаны і адрамантаваны ўсе машыны. Для паляпшэньня якасьці ў цэху ўстаноўлены штукавальная машына і машына «Левіс». 120 чалавек зараз займаюцца павышэньнем сваёй кваліфікацыі. Пуск цэху чакаецца 6 чэрвеня.

Аднак, трэба адзначыць, што сканцэнтраваўшы ўвагу на хутчэйшым пуску цэху палітo, астатнія цэхі выпалі з поля зроку заводзкай адміністрацыі. Закрыцьцё цэху палітo не паслужыла сыгналам для астатніх цэхаў з тым, каб палепшыць якасьць прадукцыі ў сябе.

У цэху па пашыўцы штаноў (начальнік цэху Казьлянскі, майстры Асінскі, Садкін і Саламонік) ляжаць недакончанымі 80.000 пар штаноў, з якіх каля 10.000 бракаваных, астатнія патрабуюць пераробкі з-за няправільнай пашыўкі абшлагоў. Гэтыя штаны затрымліваюць таксама выпуск 30.000 пінжакоў.

Аб тым, што брак на фабрыцы ўсё яшчэ мае патражаючы характар, сьведчыць тое, што калі за пяцідзённку—з 24 па 28 мая на склад паступіла бракаванай прадукцыі на 29.603 руб., дык за другую пяцідзённку—з 28 мая па 3 чэрвеня паступіла бракаванай прадукцыі ўжо на 46.106 руб. Гэтыя лічбы кладуцца цялкам на ўсю фабрыку, прымушаюць зноў біць трывогу.

Між тым, фабрыка мае ўсе неабходныя ўмовы для таго, каб выпускаць са свайго канвэеру добрай якасьці гарнітуры і палітo і ў колькасьці прадугледжанай прамфінпляном. Фабрыка абсталявана паводле апошняга слова тэхнікі, поўнасьцю забясьпечана машынамі, сырцом, рабочай і тэхнічнай сілай. Справа толькі ў канкрэтным кіраўніцтве, у мабілізацыі рабочых на канчатковае зьнішчэньне браку.

Арк. Зарубежны,
Н. Абезгауз.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Беларускія пісьменьнікі ў старшыні СНК БССР тав. Галадзеда

6 чэрвеня група беларускіх пісьменьнікаў у складзе старшыні аргкамітэту ССПБ тав. КЛІМКОВІЧА і т. т. АЛЯКСАНДРОВІЧА, БЭНДЭ І ЗНАЁМАГА наведала старшыню СНК тав. ГАЛАДЗЕДА.

Дэлегацыя паведаміла тав. Галадзеда аб становішчы на літаратурным фронце і аб тэй рабоце, якую прарабілі пісьменьнікі ў часе веснавой пасеўнай кампаніі.

У гутарцы тав. ГАЛАДЗЕД спыніўся на вялізарным значэньні, якое набыла за апошні час савецкая літаратура БССР, на глыбокім прасякненьні беларускай савецкай літаратуры ў шырокія працоўныя масы.

Гаворачы аб росьце нашай літаратуры, тав. ГАЛАДЗЕД завастрыў пытаньне аб неабходнасьці выхаду беларускай савецкай літаратуры на ўсесаюзную арэну. У нас ёсьць усе магчымасьці для таго, каб лепшыя творы беларускай пралетарскай літаратуры зрабіць здабыткам шырокіх працоўных мас усяго Саюзу.

Трэба, каб некаторыя нашы пісьменьнікі хутчэй пазбавіліся ад свалаасабліва правінцыялізму, які мяжуе з нацыянальнай абмежаванасьцю.

Неабходна паялічыць пераклад твораў беларускай савецкай літаратуры на расійскую і іншыя мовы брацкіх рэспублік і наадварот, пераклад твораў рускіх савецкіх пісьменьнікаў на беларускую мову.

У заключэньне тав. ГАЛАДЗЕД сказаў:

— За апошні час у Саюзе вырасла шмат гігантаў сацыялістычнай індустрыі. Мы маем рад новых прадпрыемстваў сусьветнага маштабу. Такімі гігантамі, як Днепрабуд, Чалябінскі трактарны завод займаўся ўвесь Саюз. А вось беларуская савецкая літаратура аб гэтым ні слова.

— Мне здаецца, што ўсё гэта таму, што нашы пісьменьнікі рэдка выяжджаюць на прадпрыемствы, у саўгасы і калгасы, яшчэ менш наведваюць буйнейшыя новабудоўлі Саюзу. Адсюль вось і выцякае задача — выезд лепшых пісьменьніцкіх кадраў БССР у індустрыяльныя цэнтры Саюзу з тым, каб адлюстраваць у беларускай літаратуры вялізарнейшыя посьпехі індустрыялізацыі СССР.

Выпуск вячэрняга рабочага унівэрсытэту

Сёньня, 9 чэрвеня менскі рабочы унівэрсытэт выпускае 87 чалавек, з якіх 24 членаў партыі і 25 камсамольцаў.

Сярод выпускнікоў значная колькасьць рабочых з вялікім вытворчым стажам. 21 выпускнік зьяўляюцца вылучэнцамі і працуюць на розных адказных пасадах. Да паступленьня ва унівэрсытэт мала хто з іх ведаў больш 4 дзейсьтваў арыфмэтыкі.

Вось твар некаторых студэнтаў-выпускнікоў: тав. Кунда, член КП(б)Б, вытворчы стаж 27 год, працуе ў вагонным дэпо; т. Штыфман, член КП(б)Б, вытворчы стаж 27 год, вылучэнец у Дзяржпляне; т. Гаўрылаў, 26 год вытворчага стажу, працуе на заводзе імя Мясьнікова; т. Русановіч—жанчына, член КП(б)Б, вытворчы стаж 15 год, працуе ў Наркамлёгпраме; т. Гелер, член КП(б)Б, вытворчы стаж 23 гады, вылучэнец; т. Гарачун, беспартыйны, вытворчы стаж 21 год, працуе на таварнай станцыі; т. Гуц, жанчына, 17 год працоўнага стажу, вылучэнка.

31 проц. выпускнікоў паказаў высокую акадэмічную пасьпяховасьць.

Партыйная арганізацыя, педагагічны калектыў унівэрсытэту ўпарта змагаліся за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду аб вышэйшай школе, перабудаваўшы сваю работу такім чынам, каб даць максымум ведаў рабочаму, які, не адрываючыся ад вытворчасьці, вечарам, пасьля 7-гадзіннага рабочага дня, зьяўляўся энтузіястам унівэрсытэцкіх лябараторый.

Рад выкладчыкаў, як т. т. Гурвіч Т., Мопсік, Казлоўскі, Сіроцін, Чмялеўскі і Шкода, паказалі ўзоры барацьбы за выкананьне акадэмпляну, за павышэньне акадэмічнай пасьпяховасьці.

Гастролі Маскоўскага тэатру імя Ленсавету пачнуцца 10 чэрвеня

З прычыны таго, што адзін з вагонаў з дэкарацыямі, ня прыбыў да тэрміну ў Менск на віце чыгунці, адкрыцьцё сэзону Маскоўскага тэатру імя Ленсавету 8 чэрвеня не адбылося. Прэм'ера «Разгром» будзе пастаўлена 10 чэрвеня. Білеты і запрашэньні, выданыя на 8 чэрвеня, сапраўдны на 10 чэрвеня.

Паведамленьне

Менгарком КП(б)Б паведамляе, што наступныя таварышы павінны правесьці на прадпрыемствах растлумачальную работу аб вольным продажы хлеба. Усе таварышы павінны зараз-жа зьявіцца в партыйным калектывам і даведацца аб часе і месцы сходу.

Кудзелька—дэпо-паравозная, Башмачнікаў — хлебазавод, Гершон—фабрыка «Кастрычнік», Чарнушэвіч — завод «Ударнік», Кержаневіч — дом ураду, Пыжыкаў — «Камунар», Хадасэвіч — Эльвод, Хэйфец — фабрыка «Усход», Фэльдман — фабрыка імя Тельмана, Баскін — фабрыка «8 сакавіка», Красоўскі—шчаціннная фабрыка, Эльпэрын — «Чырвоны інвалід», Сямёнаў—групком харчэмікоў, Кавалёў—групком будаўнікоў, Сухаручкін—«Чырвоны абутнік», Каранеўскі—Энэргабуд, Карбоўскі—Саюзтранс, Бэнэн—завод імя Молатава, Пасэ—абутковая фабрыка, Багачоў—ВЭА, Брагінскі—Белдаяржбуд, Гурчанка—Водакамалтрэст, Іваноў—завод імя Мясьнікова, Рыскін—завод «Вальшавік», Генкін—трампарк, Эпштэйн—гута, Герцовіч—друкарня імя Сталіна, Шпактараў—дэпо вагонная, Картукоў—завод імя Варашылава, Хацкевіч—служба эксплёатацыі, Журомскі—цагельня 1-3, Церонак—цагельня 5-6, Рэзьнікаў—ДЗ-6, Малаў—«Чырвоны волак», Герчыкаў (кантора па продажы хлеба)—шчотачная фабрыка, Карначоў—мясакамбінат, Каган—хэмфармазавод, Дубіна—фабрыка імя Фрунзэ, Вільчак—«Чырвоны тэкстыльшчык», Зполтнік—Менбуд, Гінзбург — фабрыка імя Крупскай, Гурэвіч Н.—фабрыка «Камунарка», Фрыдлянд—шпалерная фабрыка, Гурэвіч (пракуратура)—лямцавая фабрыка, Георгадзэ—абутковая майстэрня, Флексэр—служба шляху, Коганава—сьпіртзавод, Хордэр—БСКА, Вінінская — арцель імя Крупскай, Левіна—арцель «Пралетары», Шапіра — прытарадны сельсавет, Герчыкаў—ФЗВ «КІМ», Мінц—трактарныя майстэрні, Асаўлянк—групком саюзу працмастацтва, Чачупін—Белкамунбуд, Капялевіч — кушнерная фабрыка, Карпенка—«Чырвоны хэмік», Фрайнт—арцель «ДА», Даніловіч—завод малочных кіслот, Саф'ян—малочны завод, Грэдзько—цагельня 2-4, Нэйштат—групком мэдсанпрацы, Эфрос—завод стандартных дамоў, Зяньковіч—цагельня 3, Хазан—цагельня 1, Елянеўскі—цагельня 8, Дзічкоўскі — завод ланц. Галя.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Перад падпісаньнем пакту чатырох

РЫМ, 7 (БЕЛТА). У прамове ў сэнаце, Мусаліні вылажыўшы зьмест пакту 4-х, падкрэсьліў, што ў некаторых дзяржавах вядзецца антырэвізіяністская кампанія. У сувязі з гэтым, ён напомніў зробленую ў свой час Бэнашам заяву, які сказаў, што ён ня лічыць сябе антырэвізіяністам на вечныя часы, але абумаўляе ўсякую спробу рэвізіі агульным спакоем, матчымасьцю кампэнсацый і эфэктыўнасьцю равкій.

У далейшым Мусаліні сказаў: «Пакт цікавіць непасрэдна краіны, з якімі мы праводзім гадамі палітыку шчырай і цеснай дружбы, а іменна Аўстрыю і Вэнгрыю ў Дунайскім басэйне, Турцыю і Грэцыю ва Усходнім Міжземным моры. Пакт цікавіць таксама СССР, з якім мы нядаўна заключылі гандлёвы дагавор».

***

ВАРШАВА, 7 (ТАСС). Афіцыёзная «Газэта польска» з повяду чутак аб надыходзячым парафаваньні новага тэксту пакту чатырох піша: «Гэта паведамленьне, зразумела, ня зробіць уплыву на пазыцыю Польшчы. Гарантыі, якія французкі ўрад дае сваім саюзьнікам, ня ў стане зьнішчыць небясьпеку рэвізіі мірных дагавароў».

***

РЫМ, 7 (ТАСС). Перадаюць, што англійскі ўрад таксама паведаміў аб згодзе парафікаваць пакт. Няма яшчэ адказу ад Германіі.

***

БЭРЛІН, 7 (ТАСС). У палітычных колах падкрэсьліваюць, што новы тэкст пакту ў процівагу старому, прынятаму ўсімі дзяржавамі акрамя Францыі, невыстарчальна ўлічвае важнейшыя для Германіі пункты, напрыклад, аб роўнасьці ва ўзбраеньнях. «Вольф» паведамляе, што ўрад абмяркоўвае пытаньне — ці наогул варта парафікаваць пакт у яго новай фармулёўцы. Блізка да ваенных колаў «Тэглізе рундшау» піша: «Германія наўрад ці зможа даць свой подпіс, калі замест пакту Мусаліні ёй падсунуць пакт Далад'е».

АПОШНІЯ ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Пакт чатырох падпісан

РЫМ, 7 (Белта). Сёньня Мусаліні і паслы Францыі, Германіі і Вялікабрытаніі парафіравалі пакт 4-х дзяржаў. Дзяржавы абавязаліся падпісаць пакт у як мага кароткі тэрмін.

***

ПАРЫЖ, 7 (Белта). Парафіраваны сёньня і заключаны на 10 год пакт 4-х дзяржаў гаворыць, што дагаворныя бакі будуць узгадняць паміж сабою ўсе датычныя выключна іх пытаньні і абавязваюцца прыкладаць усе намаганьні, каб ажыцьцяўляць у рамках Лігі нацый палітыку дзейснага супрацоўніцтва паміж усімі дзяржавамі з мэтаю захаваньня міру.

Што датычыць пакту Лігі нацый, у прыватнасьці артыкулаў 10, 16 і 19, дык бакі рашаюць разглядзець паміж сабою,—агаворваючыся, што рашэньні могуць прымаць выключна рэгулярныя органы Лігі нацый.

Францыя задаволена падпісаньнем пакту

ПАРЫЖ, 7. (БЕЛТА). Як паведамляе Гавас, «парафіраваньне пакту 4-х дзяржаў спаткана ў Парыжы з тым большым задавальненьнем, што адзін час баяліся новага адтэрміноўваньня з прычыны патрабаваньня Германіі аб зьменах, накіраваных да адчуваньня ва ўступкай часьці некаторых палажэньняў, выключаных з канчатковай рэдакцыі артыкулу 3-га. Аднак, Гітлер, вярнуўшыся ў Вэрмін ў другой палове дня, рашыў зьняць патрабуемыя папраўкі і дань распаражэньне паслу ў Рыме неадкладна парафіраваць пакт. Гэта значная падзея вызначаецца, па думцы французкіх урадавых колаў, першым этапам да зьмяншэньня напружаньня палітычнага становішча ў Эўропе. Ужо цяпер, да канчатковага падпісаньня адновяцца перагаворы з мэтай вызначыць практычна значэньне пакту. Перагаворы таксама будуць закранаць паляпшэньне франка-італьянскіх адносін і адносін паміж Італіяй і Малой Антантай.

У бліжэйшыя-ж дні, або пасьля падпісаньня пакту, Францыя адновіць і пацьвердзіць у лісьце, адрасаваным урадам Малой Антанты, запэўненьні і гарантыі, якія Бонкур нядаўна вусна даваў прадстаўнікам Малой Антанты ў Жэнэве. Усім краінам, зьвязаным з Францыяй саюзнымі дагаворамі, будуць зроблены падобныя запэўненьні.

Генэральная вайна ў правінцыі Чахар

ШАНХАЙ, 8. (БЕЛТА). Учора недалёка ад Суань-Хуа ў правінцыі Чахар адбылася сутычка паміж войскамі Фан Чжэн-у (прыхільнік Фын Юй-сяна) і Фын Чжэн-хая, пасьля таго, як апошні заявіў аб сваёй лёяльнасьці ў адносінах да Нанкіна.

Муніцыпальны савет Уіка патрабуе скасаваньня эмбарго

ЛЁНДАН, 7. (БЕЛТА). Муніцыпальны савет Уіка (Шатляндыя) адагалосна вынес рэзалюцыю, якая разка пратэстуе супроць эмбарго на ўвоз з СССР. Рэзалюцыя ўказвае, што эмбарго наносіць страты англійскаму рыбалоўству, якое зьяўляецца асноўнай галіной гаспадаркі раёну Уік, і прапануе скасаваць эмбарго і прыступіць да перагавораў аб новай гандлёвай згодзе з СССР.

Антыфашысцкі мітынг у Цурыху

ПАРЫЖ, 7. (БЕЛТА). 6 чэрвеня ў Цурыху (Швэйцарыя) адбыўся вялікі антыфашысцкі мітынг, наладжаны кампартыяй. На мітынгу выступіла з дакладам дэлегацыя, якая вярнулася з Парыжу, з Эўрапэйскага антыфашысцкага кангрэсу.

Замежная хроніка

* Збанкрутавала чыгунка «Чыкаго-Рокайлэнд-Пасіфік» (ПАЗША). Яе сетка перавышае 16.000 кілёметраў і зьвязвае 14 штатаў і рад буйных гарадоў.

* З Каліфорніі (ПАЗША) паведамляюць, што на нафтаносной плошчы ля Лонг-Бічу ўзарваўся гігацкі нафтавы рэзэрвуар, сьледам за ім узарваліся 30 меншых буйных рэзэрвуараў. Налічваецца звыш 20 забітых і некалькі дзесяткаў параненых. Некалькі сот дамоў зруйнавана.

* Забаронены на другі дзень пасьля пажару ў рэйхстагу цэнтральны орган германскай сацыял-дэмакратыі «Форвэрц» у бліжэйшы час зноў пачне выходзіць, але ўжо як фашысцкі орган.

* У Дакушане (Карэя) адбылася сутычка паміж японскай паліцыяй і паўстанцамі. Забіта 7 японцаў. У раён пасланы падмацаваньні. У вуцальных каналах Сахіто (ля морскай базы Сасобу) абвалам забіта 4 і паранена 10 гарнізону.

Чыстка кіруючага складу МК УсеКП(б)

МАСКВА. (БЕЛТА). 5-га чэрвеня чырвоная зала МК УсеКП(б) была перапоўнена. Тут на агульным сходзе ячэйкі МК праходзіў праверку кіруючы склад Маскоўскай арганізацыі. Праверку праводзіла абласная камісія на чыстцы ў складзе т. т. Кнорына, Пятніцкага і Стасавай. Перад шматлюдным аўдыторыяй выступілі лепшыя сыны партыі Леніна. Іх расказы адзначаліся прастатой. Але за гэтай прастатой хаваецца выдзяляючае рэвалюцыйнае жыцьцё, жыцьцё, поўнае блёскучых узораў бальшавіцкай работы, жыцьцё толькі ў інтарэсах партыі, пралетарскай дыктатуры, сацыялістычнага будаўніцтва.

Праўкі чыстку т. т. Коган — сакратар МГК УсеКП(б), Ягораў — сакратар МК УсеКП(б) па пытаньнях абазьленьня, Доненка — сакратар МК УсеКП(б) па транспарце і Міхайлаў—самы малады з сакратароў МК. Ён — 1902 году нараджэньня, але ўжо з 16 год у партыі, і ў яго біяграфіі шмат заслуг перад партыяй.

ПРАТЭСТ СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКАГА СУДА НАД т. т. ТОРГЛЕРАМ, ДЗІМІТРАВЫМ, ПАПОВЫМ І ТАНЕВЫМ

ПАРЫЖ, 7 (Белта). Антыфашысцкі кангрэс прыняў рэзалюцыю, у якой пратэстуе супроць намеру германскіх нацыянал-сацыялістаў ускласьці адказнасьць за падпал рэйхстагу на камуніста Торглера і кіраўнікоў баўгарскага пралетарскага руху Дзіміт рава, Папова і Танева. Кангрэс заклікае рабочых усяго сьвету пратэставаць супроць пляну нацыянал-сацыялістаў расправіцца з праваднікамі рэвалюцыйнага пралетарыяту.

Арганізацыйны зьезд кампартыі Ірляндыі

ЛЁНДАН, 7 (Белта). У Дубліне адбыўся арганізацыйны зьезд ірляндзкай камуністычнай партыі. У зьезьдзе прымала ўдзел 45 дэлегатаў з усіх важнейшых цэнтраў Ірляндыі. На зьезьдзе выступалі з прывітаньнямі: Нора Конноліт О'Брыен, дачка Джыма Конноліт, кіраўніка ірляндзкага паўстаньня рабочых у 1916 г., а таксама вэтэран ірляндзкага рэвалюцыйнага руху Дэспарт.

***

ЛЁНДАН, 8 (Белта). Першым зьездам ірляндзкай кампартыі ў Дубліне выбран цэнтральны камітэт партыі. У маніфэсьце да радавых членаў ірляндзкай рэспубліканскай армії (напаўвоенная арганізацыя, якою кіруюць нацыяналісты) зьезд падкрэсьлівае, што тактыка кіраўнікоў армії аслабляе барацьбу за вызваленьне Ірляндыі і што падтрыманьне правадзімай імі палітыкі нацыянал-рэфармізму спрыяе капіталістычнай рэакцыі.

„Не адступім ад сваіх патрабаваньняў"

Сьледам за парадай бастуючых бастоцкіх тэкстыльшчыкаў з прамысловцамі, аб якой мы пісалі ўчора, адбылася другая нарада, якая цягнулася цэлую ноч. Прамысловцы адстойваюць патрабаваньні зьніжэньня зарплаты. Прадстаўнікі бастуючых тэкстыльшчыкаў заявілі, што яны ад сваіх патрабаваньняў не адступяць.

(Уласн. інф.).

Масавыя арышты ў Вэнгрыі

ВЕНА, 7 (Белта). Згодна паведамленьня з Будапэшту, у прадмесьцях арыштавана 18 чалавек, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі. Шмат рабочых арыштаваны таксама ў Дэрбрэчыне (Трансільванія) па падазрэньні ў камуністычнай дзейнасьці. Зноў арыштован нядаўна апраўданы па суду рэдактар марксіцкай часопісі «Тарша Даумісемпе» Шандор. Ён абвінавачваецца ў камуністычнай прапагандзе сярод сялян.

Канфэрэнцыя аграрных краін Малой Антанты патрабуе скасаваньня ваенных даўгоў

ВЕНА, 7. (ТАСС). Пасьля трохдзённай нарады закрылася канфэрэнцыя аграрных краін паўднёва-ўсходняй Эўропы. Старшыня, румынскі міністар фінансаў Маджэару, скардзіўся, што ўся папярэдняя дзейнасьць аграрнага блёку не дала нічога за выключэньнем «маральнага посьпеху». Рэзалюцыя патрабуе прадпачцільных тарыфаў для с.-г. прадуктаў аграрных краін паўднёвага ўсходу Эўропы, а таксама анулявання ваенных даўгоў, зьніжэньня процантаў, сьпісаньня заграніччных даўгоў і г. д. Канфэрэнцыя пастанавіла накласьці сакратарыят з месцазнаходжаньнем у Лёндане. Сакратарыят павінен падтрымліваць кантакт паміж краінамі аграрнага блёку ўвесь час, пакуль будзе засяпаць міжнародная эканамічная канфэрэнцыя.

„Беспрацоўе—структурнае зьявішча капіталізму"

ЖЭНЭВА, 6 (ТАСС). Дырэктар міжнароднага бюро працы БАТЛЕР у справаздачы канстатуе, што СУСЬВЕТНАЕ БЕСПРАЦОЎЕ СТАЛА ЎЖО СТРУКТУРНЫМ, а не часовым зьявішчам і зьвязана са структурай прамысловасьці ў капіталістычных краінах. Доказам ён, прыводзіць той факт, што ў 1928 годзе, г. зн. годзе найбольшага аднаднага эканамічнага дабрабыту з часу сусьветнай вайны, у капіталістычных краінах сьвету было 10 МЛН. БЕСПРАЦОЎНЫХ.

ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР імя 8 сакавіка Савецкая, 90.

Ад 8-га чэрвеня
НОВЫ САВЕЦКІ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
САЛДАЦКІ СЫН
у 6 частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
кіно-хроніка „САЮЗКІНО",
ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: дзённых з 2 гадз., 3 гадз. 30 мін., 5 гадз., вечэрніх з 7 гадз. і 8 гадз. 30 мін.
Каса з 1 гадз. дня.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Ад 9 чэрвеня
мастацкі фільм вытворчасьці Украін фільм.
КАЛАМУТА
драма ў 7 частках.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
ПАНАЎ, ТАІРАВА, ФЭДАРЭНКА І АЛЕГАЎ.
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
кіно-хроніка САЮЗКІНО.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня
Гукавы мастацкі прыгодніцкі фільм ЖЫЦЬ
ПРАЛЕТАРЫ
Новы мастацкі фільм ПАМЫЛКА ГЕРОЯ драма ў 6 частках
„СПАРТАК" Каса—ад 3 г. 30 м. дня
Замежны фільм ДЗЯЎЧАТЫ ТАК САМА ПАМЫЛЯЮЦЦА камэдыя ў 6 част.

НДІ Харчовай Прамысловасьці
ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА,
якая добра ведае беларускую мову.
Зварачацца: Нямігa, 9.

МАГІЛЕЎСКІ Палітасьветны Інстытут
АБВЯШЧАЕ НАБОР
на ЗАВОЧНЫ СЭКТАР
на аддзяленьні масавае і бібліятэчнае.
Прымаюцца таварышы, маючыя закончаную сярэднюю адукацыю, згодна правіл прыёму ў ВНУ. Члены КП(б)Б і ЛКСМБ павінны прадставіць камандыроўкі РК КП(б)Б, а беспартыйныя—РайАНА.
Раёны дасылаюць завочнікаў згодна разьвёрстцы НКА.
Заявы і дакументы прымаюцца да 1 верасьня.
Адрас: Магілеў, Камсамольская, 28.
ДЫРЭКЦЫЯ.

МЕНСКІ ВЫШЭЙШЫ ПЭДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ
— абвяшчае —
АСЕНЬНІ НАБОР
на 1-шы курс на наступныя аддзяленьні:
ПА ДЗЁННЫМ ІНСТЫТУЦЕ—
эканамічнае, гістарычнае (беларускае і ўкраінскае), педагагічнае, прыродалёгічнае, літаратурна-лінгвістычнае (беларускае, ўкраінскае і польскае), газэтна-выдавецкае, замежных моў, геаграфічнае.
ПА ВЯЧЭРНІМ ІНСТЫТУЦЕ—
педагагічнае, гістарычнае, літаратурна-лінгвістычнае, замежных моў.
Прыём заяў з 1-га чэрвеня да 15 жніўня.
Пачатак заняткаў 1-га верасьня.
Паступаючыя праходзяць іспыты з 20 да 30 жніўня па матэматыцы, хэміі, фізыцы, родной мове і літаратуры і грамадазнаўстве ў аб'ёме сярэдняй школы (Рабфак, тэхнікум. 9-ці годка).
Студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй (75 проц.) і інтэрнатам.
Дакументы (аб адукацыі, матрычную выпіс, заваеную анкету, аб сац. паходжаньні, аб стане здароўя і аб адносінах да вайсковай павіннасьці) накіроўваць па адрасе: г. Менск. Савецкая вул., Унівэрсытэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой 2-28, Пэдагагічны інстытут.
Дырэкцыя інстытуту.

„Даручыць Н. К. Юстыцыі забясьпечыць тэрміновы разгляд спраў па абвінавачваньні ў дрэнным абслугоўваньні пазыкатрымальніку, арганізаваўшы на гэтых справах рад паказальных працэсаў.
(З пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 29-V-1933 г.).

Т. т. ПАЗЫКАТРЫМАЛЬ